Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 47 (3951)
СЕРАДА, 18 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

8 і 7,4

Кантрольныя лічбамі 1931 г. заправяктараваны вялізарныя тэмпы разьвіцьця ўсіх галін народнай гасподаркі БССР. Асабліва вялізарныя і адказныя заданьні вызначаны кантрольнымі лічбамі для прамысловасьці — гэтага вядучага пачатку сацыялістычнай рэканструкцыі. Плян капітальных работ толькі па рэспубліканскай прамысловасьці БССР вызначан для 1931 г. у 43.680 тыс. руб., валавая прадукцыя павінна ўзрасьці на 74% па прамысловасьці ВСНГ БССР і на 100% па НКГандлю. Гэтых лічбаў ужо даволі, каб уясьніць усю сілу размаху работ трэцяга году, усю сур'ёзнасьць задач, якія ставяць перад беларускай прамысловасьцю.

Гэтыя задачы можна вырашыць толькі пры ўмове штодзённай барацьбы за вяжыцьцяўленьне на практыцы генэральнай лініі партыі, пры бязьлітасным выкрыцьці і адпоры правым і «левым» апартуністам, якія, пад прыкрыцьцём фармальнага прызнаньня партыйнай лініі, імкнуцца сарваць вызначаныя партыяй тэмпы разьвіцьця, пры ўмове баявой арганізацыі рабочай клясы на перамогу ставячы перад намі труднасьцяй, пры няўхільным росьце камуністычных форм працы, пры рашучым паляпшэньні і канкрэтызацыі кіраўніцтва тэхнічнымі працэсамі і вытворчай актыўнасьцю мас, пры неаслабным кантролі і праверцы выкананьня бягучых заданьняў.

Праграмы трэцяга году пабудаваны на тальки выходзячы з разрахунку таго ўзроўню разьвіцьця, якое мае прамысловасьць у даны момант. Раўненьне ТОЛЬКІ НА ГЭТЫЯ магчымасьці не адпавядае-б генэральнай установцы партыі НА МАКСЫМАЛЬНЫЯ тэмпы індустрыялізацыі краіны, не забясьпечвала-б ажыцьцяўленьня ленінскага лёзунгу «дагнаць і перагнаць у найкарацейшы гістарычны тэрмін у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны». Больш таго, падобнага роду раўненьне ператвара-б скочванье ў балота права-апартуністычных мінімалісцкіх установак, нівэ'р'я ў творчыя сілы пралетарыяту.

Прынятыя партыяй і ўрадам заданьні для рашаючага году пяцігодкі, паміма максімальнага скарыстаньня ўсіх вытворчых магчымасьцяй, якія ёсьць зараз, грунтуюцца на прынцыпе ПОЎНАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ ўсіх эканамічных рэсурсаў краіны, рашучага ПАВЫШЭНЬНЯ загрузкі прамысловага абсталяваньня, ПОЎНАГА ВЫКАРЫСТАНЬНЯ ўсіх унутрыпрамысловых рэзэрваў, ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ накопленьняў прамысловасьці, далейшага РОСТУ прадукцыйнасьці працы на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ЗНІЖЭНЬНЯ сабекошту, ПАЛЯПШЭНЬНЯ якасьці прадукцыі, ПАТАНЕНЬНЯ будаўніцтва, УДАСКАНАЛЕНЬНЯ вытворча-тэхнічных працэсаў і арганізацыі працы, — словам, на ЎСЁ ЎЗРАСТАЮЧАЙ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦІ ЎСІХ АСОБНЫХ ЧАСТАК ПРАМЫСЛОВАГА АРГАНІЗМУ КРАІНЫ. Толькі такая пастаноўка пытаньня, толькі самая жорсткая барацьба за максімальны размах работы прамысловасьці забясьпечвае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі на індустрыялізацыю, выкананьне гістарычнай задачы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. «Нельга зніжаць тэмпы. Наадварот, па меры сіл і магчымасьцяй, нам іх трэба павялічваць. Гэтага патрабуюць ад нас нашы абавязацельствы перад рабочымі і сялянамі ў СССР. Гэтага патрабуюць ад нас абавязацельствы перад рабочай клясай усяго сьвету. Затрымаць тэмпы, гэта значыць адстаць, а адстатых б'юць». (Сталін).

Адной з асноўных, рашаючых прадпасылак пасьпяховай рэалізацыі гаспадарчых праграм бягучага году зьяўляецца ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯ ПА ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ. Ад таго, наколькі будзе вырашана гэта праблема, у вялікай ступені будзе залежаць аб'ём капітальнага будаўніцтва, выкананьне ўсяго фінансавага пляну народнай гаспадаркі.

Зніжэньне сабекошту зьяўляецца важнейшай дадатковай крыніцай нашага прамысловага разьвіцьця, укладаньня ў справу індустрыялізацыі новых магутных матар'яльных каштоўнасьцяй. ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ — КЛЮЧ ДА ПАСКАРЭНЬНЯ ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

Наколькі важна і сур'ёзна праблема сабекошту, лёгка ўявіць сабе хоць-бы з таго, што па Саюзе 10-процантнае зніжэньне, прадугледжанае кантрольнымі лічбамі 1931 г., складае ПАЎТАРА МІЛЬЯРДА РУБ. КОЖНЫ процант зніжэньня сабекошту дае саюзнай прамысловасьці 150 МЛН. РУБ. і, «калі мы ня хочам на 1,5 мпрд. руб. памяншыць наша капітальнае будаўніцтва, трэба з усіх сіл змагацца за 10% зніжэньня сабекошту». (Арджанікідзэ).

Між тым са зніжэньнем сабекошту ў прамысловасьці БССР становішча ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Беларуская прамысловасьць у гэтых адносінах З ГОДУ Ў ГОД робіць запазычанасьць. Па прамысловасьці ВСНГБ у 1928-29 гаспадарчым годзе зніжэньне дасягнута на 4,9% супроць 6,4% паводле пляну; у 1929-30 г. — 7,8% супроць плянавых 11,5%. Папярэднія даныя за два месяцы асобнага кварталу яшчэ менш супакойваючыя і прымушаюць проста біць трывогу: зніжэньне дасягае ЎСЯГО ТОЛЬКІ 1,8% у той час, як заданьне раўнялася 7,2%. Такі сумны баляк маюць беларускія прадпрыемствы на адным з адказьнейшых вучасткаў сваёй работы.

Дзе-ж трэба шукаць карэньні падобнага ганебнага адставаньня?

Перш за ўсё прыходзіцца з усёй рашучасьцю канстатаваць, што з боку раду партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый праяўляецца яўна АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДАЦЭНКА ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ ЗНІЖЭНЬНЯ САБЕКОШТУ. У разде месц яшчэ пануюць зусім недапушчальныя адносіны да гэтага пытаньня, цэнтр увагі канцэнтруецца ТОЛЬКІ на выкананьні КОЛЬКАСНЫХ заданьняў гры адсутнасьці належнай барацьбы за ЯКАСНЫЯ паказальнікі. Яшчэ далёка ня ўсюды вытручаны шкаднейшыя разважаньні аб тым, што за недавыкананьне колькасных заданьняў прыдзецца «адказваць», а са зніжэньнем сабекошту і так пройдзе. Вельмі паказальны ў гэтым сэнсе матар'ял, які апублікаваны ўчора «Зьвяздой», аб заводзе «Калектыўная праца», дзе кіраўніцтва проста прызнае, што яны «больш увагі зварачалі на колькасныя паказальнікі, бо гэта больш важна, а са зніжэньнем сабекошту можна і пачакаць». А падобнага роду апартуністычныя разважаньні, на жаль, не адзіночныя і мацнейшым чынам б'юць па зніжэньні сабекошту.

Апартуністычная недаацэнка пытаньня зніжэньня сабекошту прыводзіць да таго, што ў цэлым радзе месц ТВОРЧАЯ АКТЫЎНАСЬЦЬ МАС НЕ КІРОЎВАЕЦЦА ПА РЭЧЫШЧЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТЫХ ЗАДАНЬНЯЎ. Скрозь і ўсюды рабочы НЯМАЕ перад сваімі вачыма ПРАКТЫЧНЫХ ПЛЯНАЎ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ, КАНКРЭТНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ у гэтых адносінах, у сувязі з чым УДАРНІЦТВА ЧАСТА ПРАХОДЗІЦЬ ЗУСІМ МІМА ПРАБЛЕМЫ ЗНІЖЭНЬНЯ САБЕКОШТУ.

РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ, якая зьяўляецца асновай зніжэньня сабекошту, АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, — яшчэ далёка не дасягнулі таго ўзроўню, на якім яны павінны быць. Месячнік рацыяналізацыі, які зараз праводзіцца, з усёй відавочнасьцю паказвае, што на цэлым радзе прадпрыемстваў рацыяналізатарская работа знаходзіцца на задворках, што рабочыя прапановы нярэдка сустракаюць яўна бюракратычныя адносіны. Нельга не адзначыць таго, што цэлы рад прадпрыемстваў, напрыклад, барысаўскія, нават ня ўключыліся ў месячнік рацыяналізацыі.

З пытаньнем зніжэньня сабекошту непарыўна зьвязана задача ЭКАНОМІІ СЫРЦУ І АПАЛУ. У гэтых адносінах для нашых заводзкіх арганізацый непачаты край работы. Ня меншыя рэзэрвы для зніжэньня сабекошту прадукцыі захоўвае ў сабе рацыяналізацыя апарату кіраўніцтва прамысловасьцю. ЗНІЖЭНЬНЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КІРАЎНІЧЫХ ВЫДАТКАЎ і г. д.

Нарэшце, прарывы ў галіне зніжэньня сабекошту нельга ня ўвязваць З НЕДАХОПАМІ АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА ОРГАНАМІ ВСНГ, у асаблівасьці ў частцы ЎЛІКУ І СВАЯЧАСОВАГА рэагаваньня на асобныя недахопы. Існуючая сыстэма ўліку настолькі грамоздкая і нязграбная, што фактычна пазбаўляе ВСНГ магчымасьці КІРАВАЦЬ справай зніжэньня сабекошту, а ставіць толькі перад фактамі прарываў.

Як можна мірыцца з тым становішчам, што пры існуючых зараз тэмпах працы ВСНГБ яшчэ ня мае даных аб зніжэньні сабекошту за асобны квартал 1930 г.? Ці-ж не паказальна, што ні ў ВСНГБ, ні ў Дзяржпляне няма канкрэтных даных аб тым, у якіх сумах павінна вылявіцца зніжэньне сабекошту ў 1931 г. Вялізарныя недахопы ёсьць і ў галіне калькуляцыі.

У сьвятле ўсіх паказаных вышэй недахопаў у галіне зніжэньня сабекошту робіцца зразумелымі вельмі нізкія паказальнікі, самыя позьнія, якія мае ВСНГ па асобных галінах прамысловасьці, а іменна за кастрычнік месяц 1930 г. Дрэваапрацоўчая прамысловасьць замест прадугледжанага плянам зніжэньня на 0,6% дала РОСТ САБЕКОШТУ на 0,9%, шкляная прамысловасьць замест зніжэньня на 6,2% мае ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ САБЕКОШТУ на 4,6%. Папяровая прамысловасьць дала зніжэньне на 0,7% супроць плянавых 8,4%, запалкавая прамысловасьць дасягнула зніжэньня сабекошту на 1,6% супроць 8,2% паводле пляну. Параўнальна здавальняючыя вынікі ёсьць па гарбарнай прамысловасьці, якая выканала ў кастрычніку 4,7% супроць 5% паводле пляну. АСАБЛІВА ПАВІННЫ БЫЦЬ адзначаны гарбарня «Бальшавік», якая дала зніжэньне на 17% пры плянавым заданьні ў 7% і віцебская гарбарня, якая дала 7% зніжэньня пры пляне 3%.

На вучастку зніжэньня сабекошту ня ўсё добра. Такога становішча нельга далей цярпець. Трэба бездакладна па-баявому ўзяцца за зніжэньне сабекошту, «наваліцца ўсім фронтам на гэту справу». Баявое заданьне партыі — у 1931 г. забясьпечыць зніжэньне сабекошту па прамысловасьці ВСНГБ на 8%, па НКГандлю — на 7,4%, па будаўнічым індэксе — на 12% — павінна быць выканана поўнасьцю. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы павінна быць узята пад самы пільны нагляд усёй партыі, усёй пралетарскай грамадзянасьці.

З першага-ж кварталу трэцяга году трэба аўпадаць вышынямі якасных паказальнікаў. Ні на адзін дзень не выпускаць з поля зроку гэтай важнейшай справы.. Заданьні рэальны. МЫ МАЕМ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ІХ ВЫКАНАЦЬ. ПОСЬПЕХІ ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЛЕПШЫМ ДОКАЗАМ ГЭТАГА. Мы павінны забясьпечыць вызначаныя партыяй тэмпы разьвіцьця ў трэцім годзе пяцігодкі. І мы гэта зробім, абвясьціўшы вайну апартуністычнай недаацэнцы ролі зніжэньня сабекошту, выкарчаваўшы самацёк у гэтай рашаючай галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

На паход імпэрыялістаў супроць савецкай пяцігодкі

АДКАЖАМ НОВЫМІ КАЛГАСАМІ І БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА СЯЎБЫ

КАЛГАС „ПЕРАМОГА“ ПАКАЗВАЕ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА СУПРОЦЬ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНЫХ СПРОБ АДАРВАЦЬ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ АД БАРАЦЬБЫ ЗА НОВАГА КАЛГАСЬНІКА

Адказ імпэрыялістам

ТАЛОЧЫНА. На раёне пасьпяхова праведзен зьлёт калгаснага актыву, які пастанавіў да вясны 1931 году калектывізаваць 35 проц. бяднацка - серадняцкіх гаспадарак, пашырыць яравы клін пасеваў на 33 проц., давесьці плошчу засеву ільну да 17 проц., бульбы—да 28 проц.

Такія-ж зьлёты праведзены па асобных калгасах і сельсаветах.

За адзін месяц, у зьвязку з ленінскімі днямі і падрыхтоўкай да сяўбы, па раёне арганізаваліся 4 новыя калгасы і ўлілося ў існуючыя 67 гаспадарак. 22 калгасьніні падалі заявы аб прыёме ў партыю, а 7—у камсамол.

Зьлёты калгасьнікаў у адказ на выпады імпэрыялістаў супроць пяцігодкі СССР пастанавілі ўзмацніць вялізацыю калгасьнікаў і па-ўдарнаму правесьці падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Калгасьнікі ўхвалілі пастанову ўраду аб адпаразовым зборы сродкаў на культурна-гаспадарчае будаўніцтва

Каржыцкая.

Прыліў у выніку ачысткі калгасаў ад кулакоў

ХАЛОПЕНІЧЫ. Кампанія перавыбараў праўленьняў калгасаў вынікала ў радзе сельсаветаў Халопеніцкага раёну значны прыліў у калгасы. ЗА АПОШНІЯ ДНІ Ў ІСНУЮЧЫЯ КАЛГАСЫ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ ЗВЫШ 50 АДНААСОБНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. ПРЫЛІЎ НАГЛЯДАЕЦЦА Ў КАЛГАСАХ, ЯКІЯ АЧЫСЬЦІЛІСЯ АД КЛЯСАВА-ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ І КУЛАКОЎ.

Перавыбары праходзяць пры вялікай актыўнасьці калгасьнікаў. ЯЎКА СТОПРОЦАНТНАЯ. Аднаасобнікі прымаюць актыўны ўдзел у перавыбарчых сходах.

АЛЯКСЕНАК.

Пляны не даведзены

ЧАШНІКІ. Падрыхтоўка да бальшавіцкай вясны праходзіць марудным тэмпамі. Масавая работа сярод бяднацка-серадняцкіх мас і калгасьнікаў яшчэ не разгорнута.

Пляны пасеўнай кампаніі ў большасьці сельсаветаў не даведзены да асобнага калгасу, да пасобнага двара. Райкалгасасаюз і райвыканкам не аддаюць гэтаму пытаньню належнай увагі.

Рамонтныя майстэрні і збожжаачышчальныя пункты да гэтага часу не арганізаваны.

А.

Лоеўшчына патрэбных тэмпаў не ўзяла

Шырокая работа на падрыхтоўцы да сяўбы праводзіцца толькі ў 7 сельсаветах, 6 з якіх пасьля абгаварэньня плянаў пасеўнай кампаніі высунулі сустрэчны плян з перавышэньнем заданьня на 327 гэкт.

Кулацтва і падпупачнікі вядуць шалёную агітацыю супроць вызначаных плянаў сяўбы. У радзе вёсак бедняки і серадняки узялі на сябе кантроль за тым, каб цьвёрдыя заданьні па засеве яравога кліну, якія даны кулацка-заможным гаспадаркам, былі выкананы.

У пагражаючым становішчы—ачыстка насенных фондаў. На 25 студзеня ачышчана ўсяго 2-3 тон збожжавых культур, або 15 проц. збожжа.

Збожжаачышчальныя абозы працуюць без адпаведнай нагрузкі і без кантролю з боку сельсаветаў. Ня створаны да гэтага часу страхавыя фонды па аднаасобным сэктары і па некаторых калгасах.

Дрэнна таксама праходзіць рамонт с.-г. інвэнтару. Трактарная майстэрня пры Дняпроўскай камуне ня можа прыступіць да рамонту трактараў з-за адсутнасьці патрэбных запасных частак.

Большасьць калгасных кузьняй не працуе.

Крэдыты не разьмеркаваны.

РАЗУМАЎ.

14 новых калгасаў

ЧЭРВЕНЬ.

За час перавыбараў кіруючых органаў калгасаў па раёне арганізаваліся 4 новых калгасы: **імя Молатава (Грабянецкі сельсавет), Новыя Дарогі (Ляднянскі сельсавет), «Ленінскі шлях» (Ляднянскі сельсавет) і Змагар (хутарскі сельсавет).**

У выніку баявой падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў радзе сельсаветаў арганізавалася 10 новых калгасаў. У існуючыя калгасы ўлілося 50 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Юшкевіч.

Пераключыцца на ўдарныя тэмпы

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.). **Дэлегаты раённага зьезду калгасаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі** па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Калгасьнікі абавязуюцца арганізаваць па ўсіх калгасах сацспаборніцтва і ўдарныя брыгады.

Дэлегаты зьезду выклікалі на сацспаборніцтва па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы раённы зьезд калгасаў **Чырвонапольскага раёну.** Для заключэньня сандагавору ў **Чырвонапольскі** раён камандыравана брыгада з калгасьнікаў.

Самацёк

ГРЭСК. (Наш кар.). Парт'ячэйкі і сельсаветы яшчэ не пераключыліся на баявую падрыхтоўку да сяўбы.

Пасеўныя пляны за выключэньнем аднаго сельсавету, да пасобнага двара не даведзены. Пляны не абмяркоўваліся на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Ачыстка насеньня ў Сышчыцкім, Грозаўскім і Палікарпаўскім сельсаветах не праводзіцца.

Насенныя і кармавыя фонды ў многіх калгасах ня створаны. У калгасах **«1-га мая», «Перамога» і «Прагрэс»** яшчэ ня скончана малацьба.

Рамонт інвэнтару і с.-г. машын не разгорнут. Рад парт'ячэек не ведае сыстэматычнай масавай работы. Падрыхтоўка да сяўбы ня ўвязваецца з калектывізацыяй.

Пасьля зьмены апартуністычнага кіраўніцтва калгасам у в. Ужа новыя 23 члены ўступілі ў калгас.

Макарэнка.

Ня сталі на чале ініцыятывы мас

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. **Падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі праходзіць пад знакам далейшага разгортваньня калгаснага руху і ўвязана з арганізацыяй новага прыліву.**

Так, за час падрыхтоўкі ў калгас «ЗОРКА» улілося 52 бяднацка-серадняцкіх гаспадаркі.

Арганізаваны 3 новых калгасы ў в. Буйнавічы, Тартак і Капашелька. Калгасы абагулілі рабочую жывёлу і асноўныя сродкі вытворчасьці.

На большасьні калгасаў раёну шырока разгорнута падрыхтоўка да сяўбы. Пляны пасеўнай кампаніі распрацаваны на сходах калгасьнікаў. Ачыстка і абмен насеньня разгорнуты.

Раённыя арганізацыі злачынна марудзяць з афармленьнем новых калгасаў.

Райкаапсаюз затрымлівае рэалізацыю штучнага ўгнаеньня. Прыбыўшае ўгнаеньне ляжыць на станцыі. Рамонт машын не арганізаван.

Прафсаюзы, камсамол і інш. грамадзкія арганізацыі яшчэ не раскачаліся.

М. М.

У баку ад падрыхтоўкі

СІРОЦІНА. (Наш кар.). Тэмп падрыхтоўкі сіроцінскай МТС да сяўбы перавальваючы. За ўвесь час адрамантаваны толькі два трактары. Ніякіх мер ня прымаецца для забясьпячэньня МТС запаснымі часткамі.

МТС да гэтага часу дагэ ня мае вытворчага пляну. Дагаворная кампанія не разгорнута.

На складах у Сіроціне ёсьць розныя сельска-гаспадарчыя машыны, але ніякіх мер да перадачы раду в іх МТС па прымаецца.

Пры МТС арганізаваны курсы трактарыстаў на 180 чал., а налічваецца толькі 120. Нічога ня робіцца для шуміна ўкамплектаваньня курсаў.

Kvp.

Ударнікі калгаснае будоўлі

СТАРОБІН. Увесну мінулага году ў в. Застарыньне арганізаваўся невялікі калгас «Перамога» з 6 гаспадарак. Кулацка-заможная частка вёскі ўвесь час гаварыла аб тым, што калгас разбурыцца. АЛЕ ЎПАРТАЯ ПРАЦА І НАСТОЙЛІВАСЬЦЬ КАЛГАСЬНІКАЎ ДАШЧЭНТУ РАЗЬБІЛІ КУЛАЦКІЯ МАРЫ.

Калгасьнікі, пад кіраўніцтвам партыйнай і камсамольскай ячэйкі, паўдарнаму правялі веснавую сяўбу, уборку і зяблёва, выканалі пляны загатовак, увязаўшы ўсю работу з арганізацыяй новага калгаснага прыліву. У выніку ЛІК БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК У КАЛГАСЕ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ДА 23, ШТО СКЛАДАЕ 52 ПРОЦ. АГУЛЬНАГА ЛІКУ ГАСПАДАРАК В. ЗАСТАРЫНЬНЕ.

На агульным сходзе калгасьнікаў пры шырокім удзеле бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, у разапцюю па справаздачы праўленьня ўнесен пункт, які АБАВЯЗВАЕ КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА ДА ПАЧАТКУ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ЗАВЕРБАВАЦЬ У КАЛГАС АДНАГО АДНААСОБНІКА.

У ЧАС РАЁННАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ КАЛГАСЬНІКІ РАЗАМ З АДНААСОБНІКАМІ АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ХЛЕБАМ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ Ў КАЛГАСЕ Ў ПОЎНЫМ РАЗГАРЫ. Складзен і абгаворан вытворчы плян сяўбы, насенны фонд ссыпан, стварацца фуражны фонд, рамантуецца інвэнтар.

ЯФІМЧЫК.

Пастанова СНК і ЦК КП(б)Б

Пра зьмену і дапаўненьне пастановы СНК і ЦК КП(б)Б „аб кантрактацыі яравых культур пасеву 1931 г.“

На зьмену і дапаўненьне сваёй пастановы «Аб кантрактацыі яравых культур пасеву 1931 году» (апубл. у газ. «Савецкая Беларусь» 1931 г. № 28) СНК і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

I. Арт. 1 і 2 разьдзелу V запісаць у наступнай рэдакцыі:

«1. Плян кантрактацыі ўстанавіць у 194 тыс. га, з яніх 62 тыс. га тэхнічнай бульбы, 129 тыс. га сталовай бульбы і 3 тыс. га раньняй сталовай бульбы. Размеркаваньне гэтай плошчы па сэктарах і раёнах ускладаецца на Наркамгандлю».

«2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў на плошчы 25 тыс. га тэхнічнай бульбы ў разьмеры 24 руб. на га.

Устанавіць забясьпячэньне адгружкаў бульбы па кантрактацыі ў спэцыялізаваных раёнах павакол буйных гарадоў БССР у колькасьці 5 тыс. тон хлеба. Нормы прэміяваньня па раёнах і сэктарах устанавіць Наркамгандлю».

II. Арт. 2 разьдзелу VI запісаць у наступнай рэдакцыі:

«2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па кантрактацыі садавіны, гародніны і цыкорыя, усяго на суму 340 тыс. руб. і забясьпячэньне хлебам у колькасьці 600 тон».

III. Дадаць арт. 2-а разьдзелу VI наступнага зьместу:

«2-а. Разьмер аванса й нормы забясьпячэньня хлебам, кантрактацыі пасобных культур па сэктарах і раёнах, устанаўляецца інструкцыяй Народнага Камісарыяту Гандлю БССР».

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б К. ГЕЙ.

16 лютага 1931 г.
Гор. Менск.

Закрыўся пленум Менгарсавету XIII скліканьня

Тав. Валодзька— старшыня Менгарсавету



Біяграфія т. Валодзькі

Тав. Валодзька, Язэп Ігнатаў нарадзіўся ў 1887 годзе ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Працуючы на чыгунцы, тав. Валодзька прымае актыўны ўдзел у забастоўцы 1905 году. У 1917 годзе ўступае ў рады партыі. З 1917 да 1921 г. знаходзіцца на ваеннай рабоце ў Чырвонай армії, займаючы розныя адказныя пасады. Да 1929 году т. Валодзька працуе на савецкай рабоце старшынёй бабруйскага, потым віцебскага акрвыканкому.

У 1928 годзе тав. Валодзька выбіраецца кандыдатам у члены ЦК КП(б)Б, а ў 1930 годзе — членам ЦК. Тав. Валодзька зьяўляецца кандыдатам у члены ЦВК СССР і членам ЦВК БССР.

Учарайшае пасяджэньне першага пленуму Менгарсавету XIII скліканьня пачалося спрэчкамі па дакладу ўраду.

У спрэчках выказалася сем таварышоў.

У канцы заключнага слова т. **Галадзед запрапанаваў дэпутатам абвясьціць гарсавет ударным.** Прапанова т. Галадзеда была сустакана бурнымі воплескамі.

Мінгарсавет XIII Гскліканьня абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва гарсаветы Гомеля і Віцебска.

Пасылаецца прывітальная тэлеграма **ЦК УсеКП(б) і т. Сталіну.**

Пасьля гэтага т. Аксючыц зачытвае выпікі выбараў. Усяго абрана ў гарсавет 772 асобы: 585 членаў і 187 кандыдатаў. 65 проц. выбраных—рабочыя. 70 проц. рабочых-дэпутатаў—ударнікі.

У Менгарсавеце 99 сяляц, з яніх палавіна—калгасьнікі. Па партыйнасьці 57 проц. выбраных—члены партыі. Процант жанчын—28,5.

У прэзыдыум Менгарсавету выбрана 19 членаў і 7 кандыдатаў. Старшынёй гарсавету выбран **тав. ВАЛОДЗЬКА,** сакратаром—**т. ШАЛКАВЕЦ.**

Пленум выбраў 59 дэлегатаў на X-ты Усебеларускі Зьезд Саветаў, сярод якіх т. т.: **Гей, Шаранговіч, Галадзед, Рапапорт, Будзінскі, Кавальчук, Аксючыц, Каравін, Горын** (БАН), **Александровіч** (шасьменьнік) і інш.

Сёньня адбудзецца першае пасяджэньне прэзыдыуму Менгарсавету.

III-ці пленум ЦКК КП(б)Б

Вынікі праверкі і чысткі радоў КП(б)Б

Праверыць выкананьне прапаноў праверкомаў

(З дакладу тав. Ляўкова)

Учора на раніцішнім пасяджэньні пленуму з дакладам аб выніках праверкі і чысткі партыйнай арганізацыі выступіў тав. ЛЯЎКОЎ.

Праверка і чыстка радоў партыйнай арганізацыі, гаворыць тав. Ляўкоў, зьяўляецца адным з мэтадаў нашага ўнутрыпартыйнага будаўніцтва. Партыя бальшавікоў на працягу ўсёй сваёй гісторыі бязьлітасна змагалася за чыстоту сваіх радоў ад элемэнтаў з варожай пралетарыяту ідэалёгіяй. Партыя змагалася за бальшавіцкае адзінства і манолітнасьць, без чаго немагчымы былі-б яе перамогі ў барацьбе за зьнішчэньне капіталістычнага ладу і ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту.

Генэральная праверка і чыстка партыйнай арганізацыі 1929-30 г. праведзена на аснове пастановы лістападаўскага (1928 г.) пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановы XVI партканфэрэнцыі. Партыя, прымаючы пастановы аб праверцы і чыстцы сваіх радоў, выходзіла з ленінскай установкі, што камуністычныя партыі, якія працуюць у легальных умовах, павінны пэрыядычна праводзіць праверку і чыстку.

Праверка і чыстка партыі праходзіла як важнейшае папітычнае мерапрыемства партыі ў справе праверкі ідэалёгічнай устойлівасьці і баяздольнасьці усіх зьвёнаў партыйнай арганізацыі і кожнага паасобнага камуніста змагацца за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, якое праходзіць на ўмавах шалёнага супраціўленьня клясавага ворага.

КП(б)Б, як і ўся партыя, пры актыўнейшым удзеле шырокіх беспартыйных рабочых і працоўных мас ачысьціла свае рады ад клясава-чужых, нявстойлівых, апартуністычных элемэнтаў і элемэнтаў, якія разлажыліся, і якія, падпаўшы пад уплыў дробна-буржуазнай стыхіі, аказаліся няздольнымі праводзіць у сваёй рабоце партыйнай лініі і зьяўляліся ў радох партыі агентурай клясавага ворага. Ход работы па праверцы і чыстцы партыі паказаў, што гэта мерапрыемства партыі было ўспрынята ўсёй партыйнай арганізацыяй і беспартыйнымі масамі як задача вялізарнейшага палітычнага значэньня. На чыстцы прымала ўдзел больш мільёна беспартыйных. Усе праверачныя сходы, за малым выключэньнем, праходзілі пры вялікай актыўнасьці. Актыўнасьць у часе чысткі насіла здаровы характар. Калі варожыя элемэнты імкнуліся скампрамэтаваць ідэю чысткі ці паасобных камуністаў, якія цьвёрда праводзілі ў жыцьцё дырэктывы партыі, дык рабочыя масы разам з партыйнымі арганізацыямі выкрывалі імкненьні гэтых элемэнтаў і давалі ім самы рашучы адпор.

Вынікі чысткі ярка адлюстроўваюць працэсы клясавай барацьбы, якая адбываецца ў краіне. Партыя пры актыўным удзеле і дапамозе шырокіх беспартыйных рабочых і асноўных бяднацка-серадняцкіх мас вёскі ў поўнай меры справілася з выкананьнем тых задач, якія былі пастаўлены перад чысткай. Праверана 1.651 рабочая вясковая і савецкая ячэйка і 507 вайсковых ячэек КП(б)Б. З 35.345 праверваных камуністаў (без вайсковых) выключана з партыі 3.717 чал. ці 10,5 проц. На 16,5 проц. складу партыйнай арганізацыі наложаны розныя партыйныя спагнаньні.

Калі ўзяць склад выключаных з партыі па радзе заняткаў, дык маем наступнае: рабочых—8,9 проц., сялян—19,2 проц., і служачых 10,4 проц.; па сацыяльным становішчы: 8, 3 проц. выключаных прыпадае на рабочых, 15,1 проц.—на сялян і 12,3 проц.—на служачых. Гэтыя лічбы паказваюць, што РАБОЧАЯ ЧАСТКА КП(б)Б ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НАЙБОЛЬШ УСТОЙЛІВАЙ, ЗДАРОВАЙ ЧАСТКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Неабходна адзначыць, што процант (6,7) выключаных з партыі, як чужы элемэнт, амаль адпавядае ва ўсіх групах ячэек. З гэтага становішча мы робім вывад, што чужы элемэнт імкнецца прапаўзьці ў рады партыі і выкарыстаць сваё прабываньне ў яе радох для варожай дзейнасьці ва ўсіх вучастках работы. З групы выключаных за сувязь з чужым элемэнтам 8,3 проц. прыпадае на рабочыя ячэйкі, 18,3 проц.—на вясковыя і 17,8 проц.—на савецкія. Такім чынам найбольш падпаўшай пад уплыў дробна-буржуазнага акружэньня аказалася вясковая частка партыйнай арганізацыі і служачыя, і ў значна меншай меры — рабочая частка камуністаў. З другога боку мы маем такое становішча, што з усіх выключаных з партыі за парушэньні партдысцыпліны і пасьпяхасьць у партыйцы найбольшы процант прыпадае на рабочыя ячэйкі. Прычына гэтага заключаецца ў слабай пастаноўцы ў радзе вытворчых ячэек унутры-партыйнай выхаваўчай работы.

Ня гледзячы на рад нездаровых зьяўлеіч у рабоце паасобных зьвеньняў партыйнай арганізацыі, што выяўлена праверкай, і частковую засьмечанасьць радоў партыі чужымі элемэнтамі, праверка паказала, што КП(б)Б У СВАЁЙ МАСЕ РАЗАМ З КІРУЮЧЫМІ КАДРАМІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗДАРОВАЙ І ІДЭАЛЁГІЧНА УСТОЙЛІВАЙ, ЗДОЛЬНАЙ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ГЭНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ ў бязьлітасным змаганьні супроць клясавага ворага і яго агентуры ў радох партыі—правых і «левых» апартуністаў, з усякімі спробамі апартуністычнага скажэньня ленінскай лініі партыі ў нацыянальнай, наносячы руйнуючы удар па вялікад

БАРАЦЬБА БРАЦКІХ КАМПАРТЫЙ

КРЫЗІС, ГОЛАД, БЕСПРАЦОЎЕ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ— ВОСЬ ВЫНІКІ КАПІТАЛІЗМУ

ФАШЫСЦКАЯ ПОЛЬШЧА У СУДАРАГАХ ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ

Пагроза ўзброенага нападу на СССР з кожным днём становіцца ўсё больш рэальнай

ЗАДАЧЫ КПП*)

1. Пленум ЦК КПП сьцьвярджае, што як эканомка, так і тактычна-арганізацыйная лінія, ухваленыя 5-м зьездам, маюць паскорны актуальны характар для ўсёй партыі, усе намаганьні якой павінны быць накіраваны на ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў зьезду.

Зусім правільная аказалася перспектыва нагнятаньня і нарастаньня крызісу эканамічнага ў крызісу агульна-палітычны, галоўным чынам, у адносінах да Польшчы, якая зьяўляецца адным з найслабейшых звеньняў капіталістычнай сыстэмы. У зьвязку з гэтым 5-ты зьезд зусім правільна сыгналізаваў непасрэдную пагрозу антысавецкай інтэрвэнцыі, пры дапамозе якой міжнародная буржуазія шукае выхаду з эканамічнага крызісу, ускладаючы на фашысцкую Польшчу ролю авангарду імпэрыялістычных сіл і супольнага арганізатара інтэрвэнцыі на Ўсходзе. Зьезд паказаў шляхі, ідучы па якіх можна абясшкодзіць і разьбіць захопніцкія пляны польскага імпэрыялізму.

Падкрэсьліваючы, што пралетарыят Польшчы можа апынуцца ў рэвалюцыйнай сітуацыі раней, чым пралетарыят іншых капіталістычных краін, зьезд указаў курс на разбурэньне шляхам штурмовай рэвалюцыйнай барацьбы асноў фашысцкай дыктатуры і зьвяржэньня шляхам узброенага паўстаньня рабочых, сялян і салдат.

2. У апошнія месяцы гаспадарчы крызіс узмацніўся, ахапляючы адпаведна капіталістычныя краіны, якія да апошняга часу карысталіся адносным дабрабытам, Францыю. У рэшты краін наступіла агульная абвастрэньне крызісу, які разбурае асновы капіталістычнай гаспадаркі. Нават буржуазія прымушана ўсьвядоміць, што справа ідзе не аб часовым, а аб цяжкім працяглым агульным крызісе, якога яшчэ ня ведаў капіталістычны сьвет, што манапольныя формы капіталізму ня толькі не далі магчымасьці спыніць, або зьменшыць крызіс, але, наадварот, крызіс гэты яны яшчэ больш нагнялі. Амаль паўсюды прамысловы і зямляробчы крызіс выклікаюць надзвычайнае напружаньне антаганізмаў у капіталістычным сьвеце, пашырэньне фронту клясавых баёў (забастоўка мятаністаў у Бэрліне, забастоўка нямецкіх гарнякоў). Гэты крызіс шчэ раз мацней б'е на дэлай вэрсальскай сыстэме, што раз вастрэй выступае справа перагляду вэрсальскага дагавору і пабудаванага на ім плану Юнга. Узрастае небясьпека новых імпэрыялістычных войн. Адгэтуль—шалёныя намаганьні, асабліва французкага імпэрыялізму, для зьмяцаньня ваенных антаганізмаў і ўмацаваньня вэрсальскай сыстэмы за кошт СССР. Адгэтуль фарсаваная падрыхтоўка да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз, які пачынае трэці рашаючы год рэалізацыі вялікага пяціг сацыялістычнага будаўніцтва. Пашырэньне фашысцкай дыктатуры на прымежныя дзяржавы, танфэрэньня ўсходніх аграрных дзяржаў, створаньне блёку балканскіх дзяржаў, дэмпінгавая антысавецкая кампанія, інтэрвэнцыяністкія замыслы, сабатаж, якія выкрыты на працэсе «Прампартыі», інтэнсыўная прадукцыя ваеннай прамысловасьці, ня гледзячы на цяжкі эканамічны крызіс—вось доказы, што французкі імпэрыялізм, які становіцца на чале антысавецкага блёку, скарачае тэрміны свайго пляну інтэрвэнцыі супроць СССР. Працэс «Прампартыі» паказаў, што ўзброеныя выступленьні імпэрыялістаў супроць адзінай у сьвеце дзяржавы пралетарскай дыктатуры вызначаны на 1931 год. Пагроза ўзброенага нападу імпэрыялістаў на Савецкі Саюз зьяўляецца рэальнасьцю сёньняшняга дня.

3. Гэтыя фактары акрэсьліваюць міжнароднае становішча фашысцкай Польшчы, якая разам з французкім імпэрыялізмам стаіць на варце вэрсальскай сыстэмы і сваім ваенным фронтам накіравана супроць СССР. Імкненьне Нямеччыны да перагляду граніц надзвычай абвастрэньне польска-нямецкі антаганізм. Гандлёвы дагавор паміж Польшчай і Нямеччынай не падпісан да гэтага часу. Наступае фактычнае аднаўленьне мытнай вайны. Польская буржуазія распачала антынямецкую пагромную кампанію. Аднак, асноўная тэндэнцыя па-ранейшаму накіравана да антысавецкае вогды паміж фашысцкай Польшчай і Нямеччынай, якая фашызуецца. Шпаркае афарміленьне, фашысцкай дыктатуры ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам пры дзейным падтрыманьні сацыял - фашызму ў Нямеччыне, якая шукае выхаду з глыбокага эканамічнага крызісу, шляхам новага падзелу сьвету праз разгром СССР, прысьпяшае актыўны ўдзел Нямеччыны ў антысавецкай інтэрвэнцыі. З гэтае прычыны будзе ўсё больш і больш адсоўвацца польска-нямецкі антаганізм на задні плян. У гэтым кірунку старанна таксама ўзьдзейнічаць і французкі імпэрыялізм, які ў абліччы Савецкага Саюзу бачыць найвялікшую небясьпеку для так званай «незалежнай роўнавагі» і які шукае вырашэньня супярэчнасьцяй пляну Юнга шляхам вайны супроць СССР. Гэтым імкненьнем падпраўкаваны таксама і спробы паразуменьня паміж Польшчай і Літвой.

4. Усе намаганьні фашысцкага ўраду Польшчы, накіраваныя да зьмягчэньня гаспадарчага крызісу, праваліліся. Ні канфэрэнцыя аграрных дзяржаў, ні экспартная прэміяй для намешчыкаў і прамысловцаў? Польшчы, ні новыя мытныя абмежаваньні на нямецкія тавары крызісу не аслабілі. Наступае новае рэзкае зьмяншэньне прадукцыі ва ўсіх асноўных галінах прамысловасьці (каменнавугальнай, жалезнай, тэкстыльнай). Крызіс у зямляробстве набывае катастрафічныя разьмеры. Беспрацоўе расьце шпаркімі тэмпамі, перавышаючы нават лічбы беспрацоўных мінулага году. Зьмяншэньне паступленьняў падаткаў вымушвае фінансавыя розгары. Запалкавай пазыкі, якая павялічвае падаткоўны цяжар працоўных мас, хоціць толькі на экстрэмныя затыканьні дзірак у бюджэце. Што раз больш шпарэйшая надзвычайная вострасьць крызісу, усё больш выразна выступае яго структурны характар.

5. Адначасова зьвастраюцца і палітычныя элементы крызісу фашысцкай дыктатуры.

Самі выбары і вынікі выбараў, як правільна адзначае сьнежэньская пастанова ЦК—сьведчаць аб далейшым рэвалюцыянізаваньні мас, аб звужэньні базы санацыі—а імкненьне скарачэньне радоў непасрэдна ББС і радоў ППС, Стронніцтва Хлопскага. Вызваленьне беларускага нацыянал-фашызму і г.д.—гэтых прывадных пасоў фашысцкай дыктатуры ў адносінах да працоўных мас, аб далейшым уплыве нашай партыі, якая, ня гледзячы на шалёны тэрор, дабралася да шырокіх мас, якая ў галоўных пралетарскіх цэнтрах умацавала і часткова ўзмацніла сваю фактычную перавагу над сацыял-фашызмам, а таксама мае падтрыманьне з боку эксплёатаваных мас сялянства, а асабліва ў самой Польшчы.

Адначасова выбары выявілі значную няроўнамернасьць гэтага працэсу і слабасьць арганізацыйнай работы нашай партыі сярод мас. Наша партыя не змагла перамагчы, арганізаваць масавага адпору супроць тэрору, не змагла перамагчы сярод значнай часткі мас выбарчай пасыўнасьці. Гэта дапамагло пілсудчыкам здабыць значную колькасьць галасоў рабочай масы. Ураду Ніл судзкага ўдалося пацягнуць за сабою значныя масы дробнага гарадзкога мяшчанства, якое шукае выхаду ў крызісу шляхам стабілізацыі фашысцкай дыктатуры, шляхам стварэньня згодных працы паміж соймам і ўрадам. Адставаньне нашай партыі ад прысьпешанага працэсу радыкалізацыі працоўных мас, якія адыходзілі ад Цэнтралеву, палягчала перахватваньне галасоў гэтых мас хадэцыяй і эндэцыяй.

Выбары таксама паказалі, што «разлажэньне фашысцкіх і народна-фашысцкіх партый не набыло яшчэ шпаркага тэмпу, што яшчэ няма значнага расстройства дзяржаўнага апарату, асабліва ў арміі» (5-ты зьезд), хоць тэмп разлажэньня партый Цэнтралёву ўжо ў часе выбарчай кампаніі быў больш шпаркім, чым перад выбарамі. Нарэшце, дзякуючы выбарам, пілсудчыкам удалося шляхам тэрору, зашуканства і масавага крадзяжу галасоў, дасягнуць большасьці ў сойме і такім чынам стварыць уласны сойм, а адгэтуль—частковая ўдасканаліць фашысцкі апарат, узмацніць гегемонію санацыі ўнутры фашысцкага лягеру, увесьці больш строгую дысцыпліну сярод сваіх радоў.

Але ўсё гэта не азначае аслабленьня крызісу, які перажывае фашызм. У масах расьце нянавісьць да фашысцкай дыктатуры. Разьвейваюцца дэмакратычныя ілюзіі, якія пашыраліся партыямі Цэнтралеву. Выбары нанесьлі руйнуючы ўдар гэтым ілюзіям і веры, што пры дапамозе выбарчых картак можна скінуць фашысцкую дыктатуру. Урад Пілсудзкага-Славэка, які мае большасьць у сойме, ня можа ўзвальваць адказнасьці за няўдачы на соймавую апазыцыю. Звужваюцца манэўровыя магчымасьці фашысцкай дыктатуры.

Стыхійна павялічваецца імкненьне мас на вуліцу. Масы беспрацоўных раду гарадоў штурмуюць магістраты. Палітычныя забастоўкі ў Варшаве, Лодзі, Беластоку сьведчаць аб пераломе, ня гледзячы на хістальні, якія яшчэ назіраюцца сярод шырокіх працоўных мас. Стыхійны рух падпалаў панскіх маёнткаў на Захадзе Украіне зьяўляецца адным з найбольш яркіх довадаў нарастаньня рэвалюцыйнай сітуацыі. Рад баявых выступленьняў у польскіх вёсках, зрэшнасаньне сялянства дзіцэнту зямляробчым крызісам, падаткамі і ліхварскімі даўгамі сьведчаць аб напружаньні рэвалюцыйнага руху сярод эксплёатаванага сялянства ў самай Польшчы. Бражэньне ў лізох сацыял-фашысцкай і народна-фашысцкай партыі прыняло шырокія разьмеры (работа апазыцыя ў сацыял-фашысцкай партыі ў Лодзі, у Кракаўскай акрузе, у Верхняй Сілезіі і г.д.). Растуць настроі неадавальненьня сярод шырокіх мас гарадзкога дробнага мяшчанства. Унутраныя трэшчы ў фашысцкім лягеры ў часе выбараў выліліся ў формы нападаў і рэпрэсій у адносінах да апазыцыйных груповак.

З прычыны нагнятаньня эканамічнага крызісу і шалёных атак капіталу, масы ўсё больш упарта будуць ламаць загародкі, якія ставяцца фашызмам і сацыял-фашызмам, будуць усё больш гвалтоўна ламаць рамкі фашысцкай дыктатуры, будзе узрастаць рэвалюцыйны рух у арміі. (Рамбэртаў), будзе ўсё больш нагнятацца раслажэньне фашысцкага лягеру. Абурэньне мас можа давесьці да стыхійных выбухаў, як у горадзе, так і на вёсцы. Шпарка набліжаецца хваля завострэнага змаганьня, якое пры актыўным удзеле нашай партыі будзе перарастаць у вялікія баі за ўладу.

*) Надкрэсьлена мною—С. Ж.

*) Мы пачынаем друкаваньне з рэвалюцыі II пленуму ЦК КПП, які пайдзе адбыцца.

Луцкія катаваньні—гэта толькі кропля ў моры

На старонках «Зьвязды» ўжо надавалася аб арышце ў Лодзі легальнага зьезду ПНС-лявіцы—у колькасьці **350 чал. Афіцыёз** фашысцкага ўраду «**Газэта Польска**» ў № 36 піша, што напярэдніе «сьледзтва» ўсіх арыштаваных, г. зн. «доньт» у дэфэнзыве, скончылася. «Вынікі папярэдняга сьледзтва,—піша фашысцкі орган,—а таксама вялізарны матар'ял, нібы, захоплены ў часе арышту, прадстаўляецца проста сэнсацыйным».

Далей фашысцкі афіцыёз са смакаваньнем піша, што «сярод 350 арыштаваных знаходзяцца 28 вядомых камуністычных дзеячоў, якім ужо ў часе папярэдняга сьледзтва ў дэфэнзыве прад'яўлена абвінавачаньне ў шпіянажы».

Арыштаваныя разьмешчаны ў дзьвёх турмах—**Серадзкай і Ленчыцкай**. Акты папярэдняга сьледзтва абнімаюць 500 старонак друку на машынцы.

Большая частка арыштаваных—як зазначае далей газэта,—абвінавачваецца па 101 і 102 арт. царскага КК. Яшчэ загадка фашысцкі орган заяўляе, што ім пагражае кара **ад 8 да 10 год катэргі**.

Адначасова «Газэта Польска» паведамляе, што лодзінская пракуратура зьвярнулася ў міністэрства ўнутраных спраў з патрабаваньнем закрыцьця ППС-лявіцы, высоўваючы пры гэтым прычынай нібы «супольную працу з камуністычнай партыяй».

Орган польскіх сацыял-фашыстаў «Роботнік» са задаваленьнем адзначае, што «**на суд будзе выкліканы 1.500 сьведак, і што гэта будзе адзін з найвялікшых палітычных працэсаў у Эўропе**». *)

Пасьля арышту зьезду пачаліся масавыя арышты членаў гэтай рэвалюцыйнай рабоча-сялянскай арганізацыі і ліквідацыя аддзелаў гэтай арганізацыі ва ўсёй Польшчы.

* * *

Лютае крывавы тэрор па абшарах фашысцкай Польшчы. Зараз няма таго дня, каб у тэй ці іншай мясцовасьці «туремная дзяржавы» не адбываліся масавыя вобыскі, арышты, а то і аблавы на абшарах цэлых валасьцей, і нават паветаў на рэвалюцыйных рабочых і сялян. Увосень мінулага году крывавую хваляю пранесься на ўсёй Заходняй Украіне ураган карных экспэдыцый, якія потым перакінуліся на Заходнюю Беларусь. Далей непарўпай чаралой ідуць новыя крывавыя, «гэраічныя ўчынкі» фашысцкіх катаў на акупаваных землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Пры актыўным падтрыманьні беларускіх нацыянал-фашыстаў — **Луцкевічаў, Астроўскіх і К°** зноў разграмляецца ТБШ, беларускі рабоча-сялянскі пасольскі клюб «**Змаганьне**», а прадстаўнікі гэтага клюбу, лепшыя прадстаўнікі беларускіх працоўных мас на дзесяткі год кідаюцца фашызмам за туремныя краты.

Палкоўніцкаму ўраду фашысцкай Польшчы, ураду авантур і падрыхтоўкі да ўзброенага нападу на СССР мала ўсяго гэтага. Мала было вырваць тысячы лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўнага сялянства і кінуць іх у турмы. Фашызм налажвае паход **за фізічнае зьнішчэньне рэвалюцыянераў у засьценках дэфэнзывы**. Паводле загаду зьверху, дэфэнзыўныя сабакі польскага фашызму для выслугоўваньня перад сваімі панамі, для атрыманьня чыноў і арденоў за сваю вернную службу з захапленьнем узляліся за выкананьне загадаў сваіх хлебадаўцаў. У адносінах да арыштаваных рэвалюцыянераў імі ўжываюцца такія мэтады катаваньняў і тэрору, якім-бы пазайздросьцілі нават гішпанскія сярэдня-вяковыя інквізітары. Царская ахранка і расійскія басьцюны бледнеюць перад засьценкамі польскага фашызму. Адно толькі слова «Луцк» прыводзіць у жах кожнага пралетара і выклікае жаданьне адпомсьціць. Сёньня Беластокам і Луцкам маперы ў Заходняй Беларусі і Зах. Украіне налогаюць сваіх дзяцей. Валасы паўстаюць дыбам ад зьверстваў луцкіх катаў—садыстаў, якія згвалтавалі нямоўлятнюю дзяўчыну, пасьля зьдзекваліся і катавалі яе да страты прытомнасьці. Увосьвечы ў палавыя органы распалёнае жалеза. І гэта робяць чыноўнікі, афіцыяльныя прадстаўнікі дзяржавы, якая ганарыцца сваёй эўрапейскай «цывілізацыяй», якая зьбіраецца адгародзіцца «кітайскай сьцяной» ад «бальшавіцкай заразы», ад «азіятчыны».

Але гэтага мала. Мала адзначыць факт дзікага барбарства. Больш важным зьяўляецца тое, што буржуазная грамадзтва фашысцкай Польшчы ня толькі не ўзьняло свайго голасу пратэсту супроць гэтых агідных адзічалых фактаў барбарства, але наадварот у асобе свайго сойму, у асобе ўсіх сваіх палітычных, юключаючы і ППС партый,—яно **благаславіла Луцк, благаславіла зьверскую расправу над палітзьняволенымі сакдыстамі—Зарэмбаю, Ткачуком і інш. і, такім чынам, прызнала садыцкія катаваньні взьвярэлых агентаў сваёй работай.**

Луцк не зьяўляецца выпадковым зьнішчэньнем у жыцьці фашысцкай Польшчы. —Гэта толькі кропля ў моры. Працэс аб так званым «замаху на Пілсудзкага», які працэс з прычыны свайго скандальнага характару перарван і адкладзен на неакрэсьлены час, працэс пэпэсэўцаў—удзельнікаў крывавай дэманстрацыі 14 верасьня зноў са скандалам усё гэта в усёй яскравасьцю выкрывае **разлажэньне, як фашысцкага, так і сацыял-фашысцкага лягеру, а асабліва—разлажэньне і банкрутства лягеру сацыял-фашысцкіх прахвостаў**

Цяжка сказаць зараз,—дзе канчаецца ППС і пачынаецца дэфэнзыва, або наадварот. **Подкупы, праваканцыя, цёплыя месцы—вось фон палітычнай работы польскага сацыял-фашызму.**

З другога боку рэвалюцыйны рух, пад кіраўніцтвам слаўнай камуністычнай партыі усё больш і больш узмацняецца. У рэвалюцыйны рух уцягваюцца ўсё больш шырокія колы працоўных мас як пралетараў у горадзе, так і працоўнага сялянства на вёсцы. Рэвалюцыйная хваля ўсё мацней б'е ў фундамант фашысцкай дыктатуры і патрасае яе да грунту. Польскі фашызм і сацыял - фашызм у сьмяротным страху перад надыходзячай пралетарскай рэвалюцыі, якая гігантскімі крокамі набліжаецца, як шалёныя кідаюцца яны ў розныя бакі, шукаючы выхаду, шукаючы выратавьня для фашысцкай дыктатуры. Польскі фашызм выхад такі бачыць толькі ў **паходзе на Савецкі Саюз ў захопе Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны.**

Ад падрыхтоўцы ўзброенага нападу польскага фашызму на СССР сьведчыць мільярды вайсковы бюджэт і сотні мільёнаў злотых, штогодна выдаткаваных фашысцкім урадам на барацьбу з рэвалюцыйным рухам, бесьпрацоўнасьцю працуючая вайсковая прамысловасьць у той час, як край перажывае цяжкі эканамічны крызіс, калі штодня закрываюцца ўсё новыя фабрыкі і заводы, а тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу, паралічваючы і да таго вялізарную армію беспрацоўных. Аб гэтым сьведчаць транспарты зброі, якія бязупынна прыходзяць на імя фашысцкай Польшчы з Францыі, Швэцыі, Чэхаславакіі, паехадкі польскіх і французскіх генштабістаў на эўрапэйскіх сталіцах, цэлы рад антысавецкіх так званых «аграрных» канфэрэнцый, а апошнімі часамі перагаворы самога маршала Пілсудзкага з ваенным фірмай «Шкода» ў Чэха-Славакіі і яго перагаворы з французкай і ангельскай дыплёматыяй па пытаньні падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР, заядаваньне глебы для забесьпячэньня сабе нэйтралітэту Нямеччыны і г. д. Аб падрыхтоўцы гэтага нападу на СССР фашызм зараз зусім адкрыта гаворыць ня толькі ў прэсе, але нават **на пасяджэньнях свайго сойму.** Таму той масавы крывавы тэрор, які зараз праводзіцца фашысцкім урадам, зьяўляецца складанай часткаю агульнага пляну падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Тэрор гэты ўзмацняецца раўналежна тэмпам падрыхтоўкі вайны. З гэтай мэтай шляхам правакацыі — гэтага ўлюблёнага мэтаду польскага фашызму ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам, фашысцкі ўрад прыступіў зараз да разгрому і ліквідацыі ўсіх тых культурна - асьветных прадзяжкі і іншых арганізацый, якія носяць хаця цень рэвалюцыйнага характару, як напрыклад, ПНС-лявіца. Адгэтуль арышт зьезду ПНС-лявіцы і разгром яе аддзелаў па правінцыі. У рух пушчан увесь апарат дэфэнзывы. Для дапамогі дэфэнзыве ППС мабілізавала ўсе свае сілы і вось **пры брацкім яднаньні фашызму і сацыял - фашызму разграміляецца рэвалюцыйныя арганізацыі пралетарыяту і сялянства, а тысячы лепшых іх прадстаўнікоў кідаюцца ў турмы.**

Падрыхтоўка да вайны супроць СССР імчыцца кур'ерскім цягнікам.

Цягнік гэты гоняць не адны толькі польскія фашысты. На барацьбу з рэвалюцыйным рухам выступае адзіным фронтам сусьветны імпэрыялізм. Нават здавалася-б, што на першы погляд такія заядлыя і непрымірымыя імпэрыялістычныя лягеры, як польскай і нямецкай буржуазіі, усё ж на справе, у барацьбе з рэвалюцыйным рухам працягваюць адзін аднаму рукі і выступаюць **адзіным фронтам.** Яркім довадам гэтага зьяўляецца апошні **правакацыйны** арышт былога дэпутата польскага сойму, аднаго з правадыроў разгромленай польскім фашызмам 100.000 Беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады—**Б. Тарашкевіча ў экстэрытэрыяльным вагоне нямецкага цягніка.** Бязумоўна, што арышт гэты адбыўся пры актыўным **падтрыманьні і па згодзе нямецкай охранкі.** Нямецкая буржуазія згадзілася нават на нарушэньне свайго суверынітэту абы толькі пазбавіцца небясьпечнага для буржуазіі рэвалюцыянэра.

Крывавы фашысцкі тэрор у Польшчы ўзмацняецца. **Фашызм вядзе фармэнны паход на зьнішчэньне авангарду польскага пралетарыяту — Камуністычнай партыі, каб такім чынам ачысьціць поле будучай крывавай бойні.** Пралетарыят Савецкага Саюзу, а асабліва БССР, павінен намагчы ўсе свае сілы, узмацніць тэмпы сваёй работы для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, зь ўзмацненьне абароназдольнасьці Чырвонай армії, бо порыяд перадышкі, вызначаны нам гісторыяй, — набліжаецца к канцу. **Пільны ўрок на Захад, цьвярдзей удары молата, мацней вінтоўку ў руках!**

С. Ж.

Масавыя дэманстрацыі пратэсту ў Лодзі

Як падае «Газэта Варшаўска» у № 47. у сувязі з масавымі арыштамі ўдзельнікаў зьезду ПНС-лявіцы ў Лодзі, перад будынкам пракуратуры і акружнога суда ў Лодзі некалькі дзён усьцяж адбываліся **значныя дэманстрацыі пратэсту.** Усклікі раз дэманстрацыі разганяліся ўзброенымі да зубоў паліцэйскімі атрадамі. Праведзены новыя масавыя арышты.

КРЫЗІС у цэмэнтовай прамысловасьці Польшчы

Эндэцкі орган «**Газэта Варшаўска**» у № 40 ад 1 лютага піша: «Мінулы 1930 год быў для польскай цэмэнтовай прамысловасьці тодам непамысным канъюнктуры. Яскравым довадам гэтага зьяўляецца аналіз лічбаў прадукцыі, збыту на ўнутраным рынку і экспарту у параўнаньні з мінулымі гадамі. Так, прадукцыя ў 1930 г. выносіла **841.035** тон супроць **1.009.058 тон у 1929 г. і 1.103.970 тон у 1928 г.** Збыт цэмэнту на ўнутраным рынку ў 1930 г. складае **777.318** тон супроць **899.872 у 1929 г. і 998.264 — у 1928 г.** Што датычыць экспарту цэмэнту дык у 1930 г. ён складаў **69.656** тон супроць **77.586 тон у** 1929 г. і **95.294** — у 1928 г.

Такім чынам прадукцыя ў 1930 г. у параўнаньні з 1929 г. вынізілася на 16,7%, а ў параўнаньні з 1928 г. на 23,8%, збыт на ўнутраным рынку зьнізіўся ў адпаведныя гады на 13,3 і 22,1%; экспарт-жа за граніцу зьменшыўся на 10,2% у параўнаньні з 1920 г. і на 26,9%—з 1928 г.

Скарачэньне прадукцыі цэмэнтовай прамысловасьці, а таксама зьмяншэньне абыту цэмэнту ўнутры краю паказваюць на зьмяншэньне будаўніцтва ў краі і зьяўляюцца адным з паказальнікаў заміраньня эканамічнага жыцьцяў у фашысцкай Польшчы.

Фашызацыя прафсаюзаў у Польшчы

ВАРШАВА. Апублікавана дэмагагічная адозва так званай «рабочай групы» беспартыйнага блёку па пытаньні аб прафсаюзах. Адозва высоўвае лёзунг аб'яднаньня ўсіх прафсаюзаў «на грунце польскай дзяржаўнасьці, беспартыйнасьці і незалежнасьці». Гэта першая ластаўка будучай фашызацыі прафсаюзаў зьяўляецца заветнай марай польскіх фашыстаў і вельмі магчыма, што пытаньне аб абавязковай прыналежнасьці да дзяржаўных фашысцкіх прафсаюзаў будзе ўключана ў канстытуцыю, да перагляду якой узмоцнена рыхтуюцца цяпер у Польшчы.

БАРАЦЬБА БРАЦКІХ КАМПАРТЫЙ

„ГАЛОДНЫЯ МАРШЫ" У ЛОДЗІ

Закрываюцца капальні, спыняецца праца ў сталяліцейных цэхах. Скарачэньне ліку рабочых, падаўжэньне рабочага дня

ТРАГІЧНАЯ ІЛЮСТРАЦЫЯ ГАЛЕЧЫ Ў ВАРШАВЕ

БЕСПРАЦОЎНЫ, ЗАТОПТАНЫ СВАІМІ КАНКУРЭНТАМІ, ПАМІРАЕ Ў ШПІТАЛІ

Ноччу ў доўгай чарзе на вуліцы Добрай адбываюцца паміж беспрацоўнымі бойкі за працу.

Атака беспрацоўных на крамы і пякарні ў Радоме"

Marsze głodowe w Łodzi

Łódź, 29 grudnia. W Łodzi odbyła się demonstracja bezrobotnych pod hasłem: pracy i chleba. W szeregu sklepach bezrobotni wybili szyby

Ponadto poseł komunistyczny Danecki zwołał wiec przed gmachem funduszu bezrobotnych przy ul. Zacisze. Policja zebranych rozpędziła. Na ul. Piotrkowskiej komuniści wywiesili kilka transparentów, które zostały przez policję zdjęte.

Zamykają kopalnie — huty i walcownie milkną...

Redukcje, świętówki i przedłużenie czasu pracy

Tragiczna ilustracja nędzy w Warszawie

BEZROBOTNY PODEPTANY PRZEZ KONKURENTÓW ZMARŁ W SZPITALU.

Na pl. Starykiewicza na punkcie zbornym Z. O. M., mieszczącym się pomiędzy kliniką położniczą szpitala Dz. Jezus, a gmachem dyrekcji wodociągów i kanalizacji, wczoraj, jak zwykle zgromadził się tłum bezrobotnych, w oczekiwaniu przyjęcia do pracy. W liczbie oczekujących znalazł się i 38-letni Józef Jankowski (Oświecimska 8). Stał on około 5-ciu godzin, wskutek czego był zmęczony, wyczerpany i zziębnięty. W momencie, gdy o godz. 14 kierownik punktu zaczął zapisywać bezrobotnych, wówczas zrosie tłok i ścisk. Stojący w pobliżu Jankowski stracił siły, upadł i został przygnieciony ciężarem kilkunastu konkurentów do pracy na ulicach Warszawy. Gdy po chwili uspokoiło się, zauważono dopiero leżącego człowieka. Z polecenia kierownika nieprzytomnego przeniesiono na noszach do pobliskiego ambulatorjum szpitala Dz. Jezus. Stamtąd stratowanego skierowano do wspomnianego szpitala. Jankowski, nie odzyskawszy przytomności, zmarł w izbie przyjęć. Pozostawił żonę i dziecko. Dochodzeniem zajęła się policja XI komis

W nocy odbywają się bójki o pracę

W DŁUGIM OGONKU NA UL. DOBREJ.

Atak bezrobotnych na sklepy i piekarnie w Radomiu.

W poniedziałek w Radomiu doszło do dość poważnych rozruchów.

W Radomiu jest około 2.000 bezrobotnych z których część tylko otrzymuje zasiłki. Wo-

z artykułami żywnościowemi. Ze sklepów tych, jak również z wozów wyjeżdżających z piekarni bezrobotni zabrali wszystek chleb. W innych sklepach zabierano tłuszcze.

—вось якімі загалоўкамі стракацяць кожны дзень староннія буржуазнага польскага друку і якія сьведчаць аб тым, што фашысцкая Польшча ўсё глыбей пагружаецца ў гаспадарчы развал

Перад 25 лютага ў фашысцкай Польшчы

Мінулы 1930 год прайшоў у Польшчы пад знакам надзвычайнага абвастраньня эканамічнага крызісу і грандыёзнага разьвіцьця беспрацоўя. Гэты год, у адзнаку ад папярэдняга 1929 г., характарызаваўся пераходам рабочай клясы, асабліва беспрацоўнай яе часткі, ад **абароны да наступленьня на ўсю сыстэму фашысцкай дыктатуры.**

Падобны пераход мог здарыцца толькі ў выніку надзвычай разгорнутага сусьветнага крызісу, у арбіту якога Польшча, як самае слабае зьвяно сыстэмы сусьветнага імпэрыялізму, трапіла скарэй і глыбей, чым іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы.

Слабая канкурэнтная здольнасьць польскай прамысловасьці, як вынік яе нізкага тэхнічнага ўзроўню, прывяла ў 1930 г. да надзвычайнага ўпадку амаль усіх галін вытворчасьці. Так, тэкстыльная прамысловасьць была на працягу мінулага году **загружана толькі на 30-40 проц.** Надзвычайна скарацілася здабыча вугалю і руды. Хэмічная і дрэваапрацоўная прамысловасьць панізілася катастрафічна. Крыху лепш стаіць справа ў цяжкай мэталюргіі, але і гэта чагло здарыцца **толькі дзякуючы саветскім заказам, якія даходзяць да 90 проц.** усёй вызводзячай прадукцыі. Аб зямляробстве няма чаго і гаварыць. Гіпатэчная запазычанасьць польскіх памешчыкаў дасягнула такой вышыні, якой не дасягала на працягу мінулых 12-ці год. На чорным фоне гэтага гаспадарчага развалу цьвіце і пашыраецца толькі прамысловасьць, якая абслугоўвае каласальныя патрэбы польскага мілітарызму.

У выніку хуткага заміраньня гаспадарчага жыцьця, наступіла вялізарнейшае беспрацоўе. Колькасьць беспрацоўных у прамысловасьці ў апошні час вызначаецца **у 350 тысяч чалавек.**

З ліку сельска-гаспадарчых рабочых занята толькі 40 проц. Прафэсар Людкевіч—тэарэтык буйнога зямляладаньня вызначае колькасьць лішняй рабочай сілы ў польскай вёсцы ў 3 млн. чалавек. Зарплата занятых рабочых надзвычай мізэрная, а ў апошнія часы яна панізілася на 50-60 проц.

Наступленьне капіталістаў на жыцьцёвы ўзровень рабочых з кожным днём усё больш і больш узмацняецца. Рацыяналізацыя, побач са зьнижэньнем зарплаты і павялічэньнем рабочага дня, як адзіны сродак для павялічэньня канкурэнтаздольнасьці польскай прамысловасьці на замежных рынках, даведзена да жудасных разьмераў. Становішча сотень тысяч беспрацоўных на столькі жахлівае, што проста не хапае слоў, каб яго апісаць. Сама буржуазная прэса паведамляе, што з усёй колькасьці **у 350 тыс.** беспрацоўных дапамогу атрымлівае толькі трэцяя частка Сума дапамогі раўнаецца **25-30 грошам у дзень.**

Усе газэты ў Польшчы стракацяць паведамленьнямі аб масавых самагубствах рабочых, якія страцілі надзею на атрыманьне якой-небудзь работы.

Перад сотнямі тысяч беспрацоўных літаральна паўстала альтэрнатыва: **або жудасная галеча, амаль выміраньне, або бязьлітасная барацьба з тым ладам, які ня нараджае.**

Масавыя выступленьні беспрацоўных, пад кіраўніцтвам кампартыі Польшчы, **на працягу апошніх месяцаў,** гавораць аб тым, што рэвалюцыйны рух хутка расьце, што рабочая кляса і яго беспрацоўная частка пераходзяць ад абароны да вострага наступленьня на ўсю сыстэму фашысцкага рэжыму. У асобе кампартыі яны бачаць свайго адзінага і незломіцага кіраўніка ў гэтай барацьбе.

Барацьба гэта, у рэчышча якой ўліваюцца ўсё большыя масы накідаючых рады здрадніцкай ППС рабочых, прымае надзвычай баявы характар.

Не дапамагаюць ужо ні газавыя бомбы, ні кулямёты, якімі люта карыстаецца паліцэйчына ў распраўах з беспрацоўнымі. Даведзеныя да роспачы, яны ў цэлым радзе гарадоў Польшчы—у Торуні, Радоме, Чанстахове і Катавіцах разбураюць магістраты, біржы працы і вядуць з паліцыяй сапраўдныя баі. Усе гэтыя выступленьні беспрацоўных канчаюцца дзесяткамі забітых і параненых. Сярод забітых аказалася вельмі многа паліцэйскіх і нават прадстаўнікоў вышэйшай адміністрацыі.

Урад Пілсудзкага, які задыхаецца ў ціскох глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу, а таксама пад уплывам рэвалюцыйных выступленьняў рабочай клясы і працоўнага сялянства, гатоў пайсьці для выратаваньня фашысцкай дыктатуры на самую небясьпечную авантуру.

Падрыхтоўваючыся шалёнымі тэмпамі да інтэрвэнцыі супроць СССР, фашысцкі ўрад накіраваў усе намаганьні на задушэньне рэвалюцыйнага руху. Усе сапраўдныя клясавыя арганізацыі пралетарыяту і працоўных мас, прафсаюзныя і культурна-асьветныя, якія карысталіся да гэтага часу цэлымі легальнасьці, закрываюцца. Так, на днях быў арыштаваны цэлы зьезд **левай ППС у складзе 350 прадстаўнікоў,** якія сабраліся з усёй Польшчы.

Разгромлена адзіная арганізацыя польскага працоўнага сялянства «Самадапамога», якая ў адрозьненьні ад розных народніцка-фашысцкіх партый сапраўды змагалася супроць памешчыкаў і капіталістаў **за зямлю сялян без выкупу.**

Фашысцкія «цывілізатары» і «піянеры культуры» разам з беларускімі і ўкраінскімі нацыянал - фашыстамі Астроўскім, Лявіцкім і К°, гэтымі правакатарамі і здрадніцкімі нацыянальна-вызваленчай барацьбы прыпечаткамі мас, разьбілі і закрылі ўсе культурна-асьветныя арганізацыі Зах. Украіны і Зах. Беларусі, як ТБШ і «Прасьвіта». Па апошніх паведамленьнях самым нячуваным правакатарскім спосабам быў арыштаваны Б. Тарашкевіч.

Уся гэта эпапэя дзікага тэрору ўвенчваецца тысячамі ахвяр, крывавай «спэцыфікацыяй» Зах. Украіны і сотнямі замучаных рэвалюцыйных рабочых і сялян у засьценках Луцкай і іншых дэфэнзыў.

Фашысцкаму ўраду Пілсудзкага было-б немагчымым праводзіць усе свае мерапрыемствы ва ўнутранай і замежнай палітыцы **без актыўнай садзейнасьці** сацыял

НЭЙТРАЛІТЭТУ НЯ МОЖА БЫЦЬ

— Той, хто лічыць сябе нэйтральным, хто не злучае работу ў школе з барацьбой за сацыялізм, той становіцца ў лягер клясавага ворага,— так заяўляюць дэлегаты з трыбуны зьезду

НАСТАЎНІК—АКТЫЎНЫ ЗМАГАР ЗА САЦЫЯЛІЗМ

Пад кіраўніцтвам партыі змагацца за перамогу сацыялізму

З прамовы тав. Чарнушэвіча

Усебеларускі настаўніцкі зьезд мае надзвычайна важнае для толькі практычнае, але і палітычнае значэньне.

З-ці зьезд працуе ў той час, калі сацыялістычнае будаўніцтва пашырае ня толькі прамысловасьць, але і вёску. Ён адбываецца ў часе, калі ідзе ўсебаковае ўзмацненьне ня толькі рабочай клясы, але і ўсяго працоўнага насельніцтва горада і вёскі і ажыцьцяўленьне ленінскай палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі.

У выніку рашучага наступленьня сацыялізму на ўсім фронце ўсё больш абвастраецца клясная барацьба. Клясавая барацьба працяцца ў шматлікіх ды розных супрацьлеглых, супрацьстаячых ваярдых кірунках, але выліваецца ў форму кулацкага тэрору, у форму контррэвалюцыйнай дэманстрацыі (Мармарскі, СВУ, нацдэмакратычная група ў БССР і т. д).

Беларускія контр-рэвалюцыянеры нацыянал-дэмакратычнага кшталту ў распаўзаньні ідэалогіі вымушаны ў БССР. Зьвяжаючыся з ідэалогіяй і заходні-беларускага фашызму, яны імкнуліся праз інтэрвэнцыю ператварыць БССР у так званую беларускую пярэднюю рэспубліку, а на кунтавым ўстанавіць фашысцкую дыктатуру. Яны бралі стаўку на кулацтва і праз прапчапаўчыму імкнуліся ажарваць развіцьцё сельскай гаспадаркі на капіталістычным шляху.

Контр-рэвалюцыйная нацыянал-дэмакратычная заяўляла нацыянальнай ідэалогіяй і заходні-беларускага фашызму, і трэба проста сказаць у жывых вясцох дабіліся некаторых вынікаў.

Стаўка нацдэмаў на настаўніка—біта

Галоўная колькасьць настаўніцтва—адзінкі, ажыцьцяўляюць у буржуазнай нацыянал-дэмакратыцы. Але асноўная маса беларускага настаўніцтва рашуча асудзіла контр-рэвалюцыйную дзейнасьць беларускіх нацдэмаў.

Стаўка контр-рэвалюцыйных нацдэмаў на беларускага настаўніка пацярпела біта.

Вострыцьцё і зарыт групы контр-рэвалюцыйных нацдэмаў ня сьведчыць аб тым, што мы з нацыянал-дэмакратызмам ужо пакончылі. Карэньні нацыянал-дэмакратызму вастаўся і небяспека нацыянал-дэмакратызму зьяўляецца рэальнай на сёньняшні дзень. Таму адзінай з галоўных задач зьяўляецца працучая штодзённая барацьба з контр-рэвалюцыйнымі беларускімі чвыгуна-дэмакратыкамі.

Адтак, праба асабліва падкрэсьліць, што галоўнай небяспекай на сёньняшні дзень зьяўляецца вялікадзяржаўны расійскі шавінізм, які ў сучасным нарыдзе пачаў актывізавацца і часамі адкрыта выступае супроць лініі партыі ў галіне нацыянальнай палітыкі, супроць беларусізацыі.

Побач з актывізацыяй вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму актывізуюцца шавіністы іншых колераў — яўрэйскі, польскі і г. д.

Разам з тым, што асноўныя масы настаўніцтва аддана працуюць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва, мы маем асобныя выпадкі ворожага, а часцей проста контр-рэвалюцыйнага выпадку.

Я прыводзіў, як прыклад, выступленьне прафэсара Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі Армфэльда. Ён таварыць наступнае:

«... Загады партыі я павінен выконваць, а калі-б была другая ўлада, я-б выконваў яе загады. У прафэсара я ня ўступаю, бо прафэсар — школа камунізму, а настаўнікам я быць не хачу. Пазат я ня чытаю і палітыкай не займаюся, бо гэта справа не мая, нехай гэтым займаюцца камуністы. Прыклад і самарытыка — гэта дзяцінства, у такіх умовах я працаваць не маху».

Вось нам, напрыклад, адкуль на цэлы рад шкодлівых пытаньняў. Сацыяльнымі працаўнікамі пакінута яго сваіх радоў і разгарнута шырокую прамадзкую работу, накіраваную супроць кулацкіх выступленьняў гэтага, з дазволу сказаць, прафэсара.

Супроць такога роду выступленьняў нам патрэбна разгарнуць работу ня толькі ў Менску. Аб гэтай контр-рэвалюцыйнай вылазцы прафэсара патрэбна давесьці да шэрагу шырокіх мас рабочай клясы і працоўнай інтэлігэнцыі.

Выступленьні клясава-варожага зьместу маюць месца ня толькі з боку рэакцыйнай часткі прафэсуры. Падобныя выступленьні маюць месца і з боку пэдагогічных, праўда, асобных, настаўнікаў.

К прыкладу, настаўніца Урэцка гаварыць наступнае: «дзеці на калектывізацыю людзі, якія нічога не разумеюць, якія робяць усё, каб зьдзівіць сьвет, таксама будзе і з палітэхнізацыяй і з беларусізацыяй». Каментарыі, я думаю, непатрэбны. На жаль, гэта Урэцка не зьяўляецца ніяк адзінкай.

Надзвычай шкодныя зьяўляецца гутаркі некаторых настаўнікаў з вучнямі на такія тэмы: на запытаньне — чаму больш стала цукру, адна настаўніца адказвае: «таму, што Амарыка не прытана 4 пароходы нашага цукру, якія аказаліся браком, вось яго, гэтак цукар вярнулі назад і прадаюць нам. Ну, што-ж, мы людзі не капрызныя».

Высьвятляць усю контр-рэвалюцыйную сутнасьць гэтых гутарак няма патрэбы. Яна кожнаму з вас вядома.

Гэтыя асобныя факты сыгналізуюць нам, што сярод настаўніцтва ёсьць яшчэ адзінкі, якія і да гэтага часу ідуць супроць партыі, супроць рабочай клясы.

Наша задача — выявіць гэтых людзей і выкінуць з настаўніцкіх радоў.

Мы павінны паставіць пытаньне рубам — або актыўна працаваць пад кіраўніцтвам партыі на карысьць сацыялізму, або з контр-рэвалюцыяй, з нацыянал-дэмакратамі супроць партыі і пралетарскай дыктатуры. Пасыўных адзінак, найлепшага на сёньня быць ня можа.

Калгасьнік Быхаўскага раёну т. Уласаў, дэлегат зьезду

Настаўнік—барацьбіт за калгас

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі — важнейшая задача нашай партыі на вёсцы. Між тым шматлікія шкоднікі, якія ня вызначылі на ўдарны квартал — 20 проц. калектывізацыі сельскай гаспадаркі па БССР — ня ня выканалі. Мы лічым, что галоўнай прычынай шкоднікаў гэтых шкодных шкоднікаў зьяўляецца тое, што правакацыялістычная стаўка на самацёк і на сёньняшні дзень поўнасьцю ня выкінута.

У мінулым тоне ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня першай бальшавіцкай весны мы мелі прыклады адданай работы настаўнікаў у справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. На сёньня мы маем таксама ад прыкладу, калі настаўнік зьяўляецца сапраўдным арганізатарам калгаснага руху. Аднак, значная частка выконваў настаўніцтва прымае значна слабы ўдзел у разгортваньні калгаснага будаўніцтва, а пасобныя «настаўнікі» разам з кулаком выступаюць супроць калектывізацыі.

Настаўніцкі зьезд павінен аддаць значную ўвагу тай адказнайшай ролі якую павінна адыграць настаўніцтва ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі і правядзеньня другой бальшавіцкай весны. Я лічу, што зьезд павінен будзе зьвярнуцца да ўсёй настаўніцкай масы БССР з заклікам аб павялічэньні ўдзелу ў справе правядзеньня другой бальшавіцкай весны, у справе рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК аб кампрэтацыі і разгортваньні калгаснага руху.

Я хачу выказаць упэўненасьць, што наша настаўнікі, якія ў асноўнай сваёй масе да гэтага часу ішлі і актыўна змагаліся разам з пралетарыятам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, за перамогу сацыялізму, і ў далейшым яшчэ больш актыўна будуць працаваць пад выкананьнем галоўнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

З трыбуны зьезду

16-га лютага. На вячэрнім пасяджэньні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Гея.

Выступіўшы тав. Абраменка спыніўся на тых посьпехах, якія дасягнуты на Клімаўшчыне ў галіне ўсеагульнага навучаньня і політэхнізацыі школы.

— Асьветнікі Клімаўшчыны перайшлі на ўдарныя тэмпы работы. Мы пасылаем шмат брыгад на вёску для дапамогі ў падрыхтоўцы і правядзеньні весенавой сяўбы.

— Клімавіцкі раён калектывізаваны на 40 проц. Настаўніцтва, пад кіраўніцтвам партыі, вядзе барацьбу за правядзеньне весенавой сяўбы пад лёзунгам «калектывізацыі сельскай гаспадаркі раёну на 60 проц.».

Тав. Таўкачоў, спыняючыся на задачах грамадзка-палітычнай работы школы і вясковага настаўніцтва, падкрэсьлівае наўпрасьць сярод настаўнікаў адзінак, якія блёкуюцца з кулацтвам і вядуць работу супроць калектывізацыі.

— Аднаму настаўніку, кажа тав. Таўкачоў,—прапанавалі правесьці сход. Ён адмовіўся. Калі праверылі, хто гэты настаўнік, дык аказалася, што гэта сын раскулачанага кулака.

Гаворачы аб барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, тав. Таўкачоў прыводзіць факт, калі дырэктар адной з ВНУ заявіў, што «у інстытуце беларусізацыя не прадугледжана навучальным планам». На пытаньне пра якой прычыне беларусізацыя не прадугледжана планам, ён адказвае «я не дацуплу ўкаравненьня нацыянал-дэмакратызму ў вышэйшай навучальнай установе».

Выступіўшы тав. Сватко большую частку сваёй прамовы прысьвяціў пытаньню кадраў.

— У Бешанковіцкім раёне, вылучаючы склад настаўнікаў, выяўлена 12 выхадцаў з сем'яў служак рэлігійнага культу, у тым ліку два попы. З 140 настаўнікаў толькі 19 выхадцаў з бядняцкай сям'і.

— Інтэрнацыянальнае выхаваньне, гаворыць тав. Мажар, пастаўлена ў нас дрэнна. Мы маем такія выпадкі, калі вучань задае пытаньне, ці можна выбіраць у вучоны вучэрні ня рускай нацыянальнасьці. Не заўсёды настаўнікі на такія пытаньні адказваюць як сьлед.

— Трэба выкінуць з нашых школ рашткі падручнікаў з клясава-варожымі ўстаноўкамі, замяніўшы іх палітычна-выгрымаными.

Тав. Шчарбакоў спыняецца на дасягненьнях БССР у галіне будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры.

— Апрач Беларускай Акадэміі Навук, мы маем 15 галіновых навучальных устаноў, арміі настаўнікаў узрасла да 20 тыс. чал. Справа ў тым, што ў тэзы настаўнікаў мы маем вялікую сілу, якая працуе на культурным фронце. Большую частку сваёй прамовы тав. Шчарбакоў зашчыняе пытаньнямі навукова-дасьледчай работы.

Былы пасол польскага сойму тав. Рак-Міхайлоўскі перадаў зьезду прывітаньне ад працоўных скрыжаваньня польскім фашызмам Зах. Беларусі.

— Вы пачуеце,—гаворыць тав. Рак-Міхайлоўскі,—тым, што ў нашай вольнай краіне можна праводзіць вялікую працу, як у школе на падрыхтоўцы кадраў, так і ў справе правядзеньня калектывізацыі вёскі.

Вельмі пажадана, каб усе настаўнікі сталі ўдарнікамі, каб усе былі захопленыя ідэйным энтузіязмам. У вас на роднай мове распаўсюджваецца пралетарская асьвета, а там, у панскай Польшчы, школы выключна польскія, беларускіх школ няма. Праходзіць шпарка над прымусам фашысцкай улады апалячаньне беларускіх працоўных мас.

Тут у краіне Саветаў адбываецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, узьдымаецца культура зямлі, уводзяцца трактары, а там такая галота, такая бядота, такое ўбоства, што пагладзяцца выпадкі пераходу ад плуга да сакі. Вёска зусім зьбяднела.

Тысячы беспрацоўных—гэта звычайнае зьявішча ў такіх гарадох, як Варшава, Беласток, Вільня.

— Адзіны шлях да вызваленьня ад капіталізму і фашызму зьяўляецца шлях, на які кліча рабочая кляса і камуністычная партыя.

Рады і аўтарытэт камуністычнай партыі павялічваюцца. Мне здаецца, што надалёка той дзень і час, калі мы ў Зах. Беларусі, Украіне і Польшчы будзем сьвяткаваць свой Кастрычнік (Воплескі).

Выступіўшы тав. Платун сваю прамову далкам прысьвяціў выкрыцьцю сутнасьці нацыянал-дэмакратызму і яго ідэолёгаў.

— Вы ведаеце,—гаворыць тав. Платун,—«гісторыю Беларусі» Ігнатоўскага. Гэта «гісторыя» прасякнута нацыянал-дэмакратычным зьместам. Там ёсьць месцы, дзе гаворыцца, што ў Беларусі няма класаў, што ў Беларусі няма такога кулака, які быў на Маскоўшчыне.

Тав. Платун падрабязна спыніўся на нацыянал - дэмакратычнай сутнасьці творчасьці Цішкі Гартнага, Янкі Купалы і іншых.

Далей у спрэчках выступілі тав. Дуеўскі і Шуб.

У канцы пасяджэньня зьезд віталі прадстаўнікі надшэфнага эскадрону, дэлегаты 20-й школы, прадстаўнікі Палесдруку (Гомель), вучні і настаўнікі калектыву 33-й школы рабочай фабрыкі «Герой працы».

З адказам на прывітаньне выступілі т. т. Рычкоў і Бурдзін.

***

Раніцяе пасяджэньне 17 лютага было прысьвечана працягу спрэчак па дакладу т. К. В. Гея.

З 100 дэлегатаў, якія запісаліся ў спрэчках, пасьпела выказацца 31 чал.

Выступаўшы дэлегаты запэўнілі камуністычную партыю, яе ленінскі ЦК і ўрад, што яшчэ шчыльней згуртуюць настаўніцкія рады вакол партыі і, пад яе кіраўніцтвам, з посьпехам выпраўць задачы, пастаўленыя зьездам перад настаўніцтвам.

Пасьля спрэчак з заключнай прамовай выступіў тав. Гей.

На імя зьезду атрымана прывітальная тэлеграма ад настаўніцтва Татарскай рэспублікі. Таксама прыбыла дэлегацыя ад Маскоўскай і Ленінградзкай вобласьцей.

Дэлегаты зьезду выступалі на мітынгах рабочых заводаў «Энэргія» і «Казмар».

К канцу пасяджэньня з вялікім даладам на тэму: «Вышкі і перспэктывы культурнага будаўніцтва БССР» выступіў наркамасьветы тав. Платун.

Лом—мартэнам

БССР ня выканала студзеньскага заданьня

Арганізуем месячнік па ўзмацненьні збору лому

ДЛЯ ЗБОРУ ЛОМУ СТВАРЫЦЬ УДАРНЫЯ ТРОЙКІ

Усім дырэктарам заводаў і прафсаюзным арганізацыям за подпісамі старшыні ВСНГ СССР т. Арджанікідзэ і сакратара УсеЦСПС т. Вэйнбэрга разасланы ліст аб узмацненьні збору лому. Арганізаваны УсеЦСПС у лістападзе 1930 году ўсесаюзны збор мэталалому, —гаворыцца ў лісьце, — даў значнае павялічэньне адгрузкі лому мэталюргічным заводам (кастрычнік даў 136.000 тон, лістапад — 176.000 тон, сьнежань — 215.000 тон). Збор лому чорных і каляровых мэталяў зьяўляецца адной з галоўных задач на мабілізацыі рэсурсаў для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і прамфінпляну 1931 году. Аднак, весткі аб адгрузцы мэталялому ва студзень (53% пляну па СССР) сьведчаць аб зусім слабой рабоце гаспадарчых і многіх прафсаюзных арганізацый па зборы лому, недакват якога зрывае выкананьне прамфінпляну чорнай мэталюргіі.

Улічваючы, што значнае недавыкананьне пляну па зборы лому за студзень і першую дэкаду лютага ставіць пад пагрозу ня толькі работу мэталюргічных заводаў, але і работу іншых галін народнай гаспадаркі і патрабуе максымальнай мабілізацыі ўвагі ўсіх гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый і ўсіх рабочых на поўнае выкананьне ускладзеных урадам на трэст «Металлом» заданьняў па зборы і адгрузцы лому, ВСНГ СССР і УсеСЦПС прапануюць: у пяцідзённы тэрмін арганізаваць на ўсіх прадпрыемствах ударныя тройкі па зборы лому (тройкі складаюцца з прадстаўнікоў заводакіраўніцтваў, прафарганізацый і трэсту «Металлом»). Гэтыя тройкі пры непасрэдным удзеле рабочых-ударнікаў, камсамольскіх арганізацый, вытворчых нарад і інжынэрна - тэхнічных калектываў павінны забясьпечыць сыстэматычнае выяўленьне і збор мэталялому на ўсім прадпрыемстве, арганізаваць сыстэматычны нагляд за пераводам зусім непагодзнага абсталяваньня ў лом, не дапускаць накапленьня сабранага лому, забясьпечваючы неадкладную вывазку яго з прадпрыемства, пагрузку і здачу трэсту «Металлом», скарыстоўваючы для гэтага ўсё перавозачныя сродкі, у тым ліку і заводзкі транспарт. Работа троек павінна быць настаўлена пад кантроль усіх заводзкіх арганізацый.

Збор мэталялому павінен быць пастаўлен у цэнтры ўвагі вытворчых нарад. Трэба арганізаваць рэгулярную інфармацыю на заводзкіх, цэхавых і групавых вытворчых нарадах аб ходзе работ па выяўленьні, зборы і адгрузцы мэталялому, разгарнуўшы пры гэтым сацыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі і брыгадамі, складаньне сустрэчных пляноў на зборы лому, забясьпечваючы актыўны і штодзённы ўдзел кожнага рабочага і асабліва ўдарнікаў у выкананьні гэтых пляноў.

Для забясьпячэньня ўсёй работы на зборы мэталялому аўтагужавыя і транспартныя арганізацыі павінны прадастаўляць заводам аўта-гужавы і вагонны транспарт для вывазкі лому і хутчэйшай адпраўкі яго на мэталюргічныя заводы.

На прадпрыемствах трэба арганізаваць сыстэматычны ўлік лому і адкідаў чорных і каляровых мэталяў.

Тых адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў, якія ня выконваць вышэй паказанага парадку збору, адпраўкі і захаваньня лому, ліст т. т. Арджанікідзэ і Вайнбэрга прапануе прыцягваць да адказнасьці.

Па ўсім Саюзе з 15 лютага па 15 сакавіка будзе праведзен месячнік па зборы і адгрузцы мэталялому. Па БССР гэты месячнік мяркуюць пачаць з 20-га лютага. Трэба неадкладна разгарнуць масавую работу вакол месячніка і дабіцца ў бліжэйшыя-ж дні рашучага перапому ў выкананьні ўрадавых заданьняў па зборы мэталялому.

***

Пры беларускай канторы трэсту «Металлома» створана надзвычайная пяцёрка па ліквідацыі прарыву па зборы мэталялому. Ініцыятыву па стварэньні ўдарных троек, па мясцох, згодна дырэктывы, павінны ўзяць на сябе камсамольскія арганізацыі.

ХТО ЗРЫВАЕ ЗБОР ЛОМУ

Ня гледзячы на тое, што наша краіна адчувае вялікую патрэбу ў мэтале і некаторыя прадпрыемствы нават ня выконваюць прамфінпляну з-за недахвату мэталясырцу, у БССР знаходзяцца такія гаспадарні, якія МЕСЯЦАМІ НЕ ЗДАЮЦЬ САБРАНАГА ЛОМУ АБО ЛІШНІХ СВАІХ ЗАПАСАЎ.

На заводзе «ПОЛЫМЯ РЭВАЛЮЦЫІ» ёсьць каля 8 тон жалезнага лому і стружак. Адміністрацыя іх не здае, апраўдваючыся тым, што няма каму гэты лом сабраць.

На заводзе «БАЛЬШАВІК» лом раскідан па ўсім дварэ. Калі прадстаўнік «Металлома» зьявіўся на завод, дырэктар заводу сказаў: «Пачакаем пакуль растане сьнег, тады пом зьбярэм».

На ст. Менск-пасажырская — у нагляднальніка будынку ёсьць 20 пачак бляхі, у таварным дэпо ляжыць пад сьнегам 5 тон лому. У майстэрні вучняў на 2-ой Клясная вуліцы ляжаць 3 тоны жалеза. У нагляднальніка будынку тэварнай ст. ляжаць 10 пачак бляхі, тамка ляжаць 6 тон жалеза. Усё гэта засыпана сьнегам або вугалем і гаспадарнікі ня хочуць зараз вазіцца з гэтым ломам.

На Ф-цы «КАСТРЫЧНІК» ёсьць шмат лому-жалеза і чыгуну, але здаць іх ня хочуць. Калі зьявіўся агент «Металлома», дык дырэктар заявіў, што пом ня іх, а нейкага прыватніка, зараз арыштаванага, так што трэба чакаць, пакуль прыватнік вернецца.

У САЎГАСЕ МІЦРК ёсьць шмат лому, а здаць ня хочуць, бо няма фурманак, хоць у саўгасе ёсьць свой абоз і кожны дзень фурманкі ездуць у горад.

На заводзе «ЭНЭРГІЯ» ёсьць каля 8 тон бронзы, якая заводу зусім непатрэбна, але завод трымае бронзу пра запас, можа праз пару год будзе патрэбна.

На заводзе «ЧЫРВОНАЯ ЗАРА» ёсьць 8 тон чыгуну, а побач ёсьць заводы, на якіх взагалі стаіць з-за адсутнасьці лому. А здаць пом яны ня хочуць, бо можа праз пару год ім патрэбна будзе НЕКАЛЬКІ ПУДОЎ для калгасьнікаў.

Такіх фактаў вельмі шмат. Вышэйшыя гаспадарчыя органы і прафарганізацыі павінны рашуча ўдарыць па тых, хто тармозіць выкананьне заданьняў па зборы лому і зрывае работу мэталюргічных заводаў.

ГАЛІНЕЦ.

Пакрыць студзеньскі прарыў

БССР недадала ў студзені 1.325 тон чорных мэталяў і 57,82 тоны каляровых

Партыя і ўрадам ускладзена на мэталюргічную прамысловасьць надзвычай адказная задача — даць цяжкай індустрыі 6 млн. тон чыгуну. Для забясьпячэньня мэталюргічных гігантаў сырцом — ломам, «Металлом» атрымаў заданьне сабраць у 1931 годзе 3,5 млн. тон чорнага лому і 200 тыс. тон каляровага.

З гэтай колькасьцю лому па БССР трэба сабраць 47 тыс. тон чорнага і 1.400 тон каляровага мэталю. Але гэта заданьне пакуль што выконваецца вельмі марудна. За студзень ёсьць значны прарыў: заданьне ня выканана на 41 проц., што складае 1.325 тон чорнага мэталю і 57,82 тоны каляровага мэталю.

Гэты прарыў прымушае неадкладна стварыць патрэбныя ўмовы для выяўленьня і здачы лому, каб ня толькі выканаць пятгадовае заданьне, але і пакрыць прарыў студзеня.

Зразумела, вялікай памылкай было-б думаць аб тым, каб выканаць гэта заданьне «самацёкам». Трэба арганізаваць шырокія рабочыя масы, прыцягнуць актывістаў - ударнікаў і заводзкія арганізацыі.

Трэба паставіць рашуча пытаньне аб зборы па ўсёй тэрыторыі БССР ня толькі заводзкага лому, але і гарадзкога — у выглядзе непатрэбных крам, агараджэньняў, помнікаў, якія не зьяўляюцца каштоўнымі рэчамі даўнасьці.

Л. КАЛАШНІКАЎ.

А. ЧАРВЯКОЎ

Да вынікаў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў*)

Гэтай справе — справе падбору і падрыхтоўкі кандыдатур мясцовымі арганізацыямі было надана асабліва важнае значэньне. Як правіла, кандыдатуры, якія рэкамендаваліся мясцовымі партыйнымі ячэйкамі, знаходзілі падтрымку з боку шырокіх пластоў выбарчыкаў. Калі-ж і мелі месца выпадкі, што гэтыя кандыдатуры прапаноўваліся, то прычынай гэтаму трэба лічыць апартуністычную недацэнку падрыхтоўкі кандыдатур з боку мясцовых кіруючых арганізацый, якія прыцягвалі мала працаўніцкіх кандыдатуры.

Напрыклад, у Пераваліцкім сельсавеце, Кохановіцкага раёну, была вылучана кандыдатура былога кантрабандыста; у Ліхачэўскім сельсавеце, Лепельскага раёну, была вылучана кандыдатура былога дваўрэцкага Чырвонай арміі; у Пілосаніцкім сельсавеце — кандыдатура растратчыка; у Пярэжырскім сельсавеце рэкамендавалі ў члены сельсавету былога царкоўнага старасту. Зразумела, што гэтыя кандыдатуры прапанаваліся. Але гэтыя злачынна шкодныя адносіны да вылучэньня кандыдатур зараз-жа імкнуліся скарыстаць ворагі, якія высоўвалі праз сваіх надзвычай свае кандыдатуры.

Адтак, у выніку недастатковай актыўнасьці з боку батрацка-бядняцкіх элементаў вёскі, у выніку тай падрыхтоўкі работы, якая была арганізавана мясцовымі арганізацыямі, мусіны склад сельсаветаў значна палепшыўся у параўнаньні з мінулым складам. Новы склад у асноўным забясьпечвае тое, што сельсаветы па справе змогуць правадзіць сваю работу па выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва і ўзмацняць сваю ролю ў правядзеньні ў жыцьцё генэральнай лініі партыі.

У выніку перавыбараў сельсаветаў у гэтым годзе мы маем павялічэньне ў сельсаветах колькасьці рабочых да 6,49 проц. супроць 5,94 проц. мінулага году; колькасьць калгаснікаў у сельсаветах рэспубліцы 21,94 проц. Адсюль вілаць, што калгаснікі ваялі ў сельсаветах адпаведнае ім месца побач з рабочымі і бядняцкімі часткамі вёскі.

В агульнай колькасьці аднаасобнікаў, якія ў саветах складаюць 66,04 проц.— 55,32 проц. складаюць аднаасобнікі, зусім ізаляваныя ад сельска-гаспадарчага падатку.

Канстатуючы ў агульным здавальняючы сацыяльны склад сельскіх саветаў, мы павінны разам з тым адзначыць, што склад пасобных сельсаветаў патрабуе неадкладнай зьмены. У некаторых сельскія саветы праляезлі кулацка-заможныя элементы. У складзе некаторых сельсаветаў няма ніводнага серадняка. У адносінах да кулацкіх элементаў трэба неадкладна скарыстаць права адкліканьня для таго, каб ачысьціць саветы ад клясава-варожых элементаў. З другога боку, трэба рашучым чынам палепшыць асуджэць тыя арганізацыі, што правялі апартуністычную недацэнку серадняка, і ў адносінах да тых сельсаветаў, дзе серадняку няма, трэба паставіць пытаньне аб новых перавыбарах гэтых сельсаветаў.

Значна павялічылася ў гэтым годзе колькасьць жанчын у саветах. Дырэктыва партыі і ўраду аб павялічэньні колькасьці жанчын у сельсаветах у сярэднім да 25 проц. вяць цалкам выканана. У гэтым годзе ў сельсаветах жанчыны складаюць 23,69 проц. супроць 19,87 проц. мінулага году.

Павялічылася ў складзе сельсаветаў колькасьць камуністаў, якія складаюць 10,84 проц. у параўнаньні з 9,48 проц. мінулага году. Колькасьць камсамольцаў у сучасным складзе сельсаветаў павялічылася да 6,55 проц. супроць 5,20 проц. мінулага складу; асабліва рэзкае павялічэньне назіраецца у пасобных раёнах, дзе колькасьць камсамольцаў у складзе сельсаветаў не дасягне 4 проц. У выніку своечасовых мер ЦК ЛКСМБ, камсамол, асабліва за апошні час прыняў актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Але трэба адзначыць, што у цэлым радзе раёнаў, асабліва ў першы перыяд справаздачна-перавыбарчай кампаніі, пасобныя раённыя камсамольскія арганізацыі праявілі апартуністычную недацэнку справаздачна - перавыбарчай кампаніі.

Мы мелі з боку пасобных камсамольскіх работнікаў зусім недапушчальныя выступленьні і ўчынкі ў часе справаздачна перавыбарчай кампаніі (выпадкі выступленьня пасобных камсамольцаў супроць кандыдатур бедняты).

Праяўленьням кулацкай ідэалёгіі і злачынных адносін да перавыбараў з боку пасобных камсамольцаў на сходах давяўся рашучы адпор з боку мас камсамольцаў, з боку батрацтва, беднаты і калгаснікаў. У працэсе разгортваньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі ЦК камсамолу былі прыняты заходы да того, каб мабілізаваць камсамол на актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі. ЦК камсамолу мабілізаваў для работы ў сельсаветах у якасьці сакратароў сельсаветаў 300 камсамольцаў з ліку батрацтва, беднаты і г. д. Гэта паказвае, што камсамольская арганізацыя адыграла важнейшую ролю ў справе перавыбараў саветаў. Аднак, тым прарывы, што мелі месца ў пасобных месцах, у выніку якіх мы ашыраем значнае зьніжэньне колькасьці камсамольцаў у сельсаветах, павінны быць ураханы ўсёй камсамольскай арганізацыі для таго, каб яшчэ ў большай меры завастрыць увагу ўсёй камсамольскай арганізацыі на пытаньнях клясавай барацьбы ў вёсцы, на затартаваньні камсамольскай арганізацыі для актыўнага ўдзелу ў клясавай барацьбе, для рашучай барацьбы супроць кулацтва, за калгасы, для ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

ЦК КПСС у сваіх дырэктывах аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі ўказаў на тое, што перавыбары павінны быць вялікшым чынам зьвязаны з выкананьнем усіх чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній, павінны сыграць іх посьпехаваму выкананьню і замацаваць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі

Трэба адзначыць, што гэта злучэньне перавыбараў саветаў з выкананьнем усіх палітычна-гаспадарчых кампаній на месцах практычна ажыцьцяўляецца.

Перавыбары яшчэ ў большай меры ўзмацнілі работу па далейшай мабілізацыі сіл на выкананьне пляну загатовак, на далейшае разгортваньне калектывізацыі, правядзеньне ўсеагульнага навучаньня і г. д.

Апартуністычны ідэалёг справаздачна-перавыбарчай кампаніі ад іншых чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній, правядзенне справаздачна-перавыбарчай кампаніі, як зарговай «кампаніі» без увагі яе з выкананьнем задач сацыялістычнага будаўніцтва, што заўважалася ў пасобных месцах, прыводзіла да зьніжэньня тэмпаў калектывізацыі, загатовак і г. д. Падварот, бальшавіцкая ўвязка ўсіх гэтых кампаній паслужыла падставай для магутнага разгортваньня на ўсёй БССР калгаснага руху, выклікала арганізацыю чырвоных абозаў, прыстасаваных да перавыбарчых сходаў, да раённых зьезду саветаў, спрыяла запаўненьню прарываў у справе ўсеагульнага навучаньня і г. д.

За час справаздачна - перавыбарчай кампаніі ў БССР арганізавалася 690 калгасаў і ўпягнута ў калгасы 11.300 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак павялічылася за гэты час на 2,5 проц.

У Дрыбінскім раёне за час перавыбараў саветаў праведзена падпіска на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на 10.712 руб., сабрана 22.100 руб. палных узносаў і 22.863 руб. пратэрмінаваных крадытаў.

Гэтыя і іншыя прыклады ярка сьведчаць аб правільнай, у асноўным, устаноўцы пры правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі на месцах.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія сельсаветаў праходзіла пад знакам надзвычайнай высокай палітычнай актыўнасьці мас, спрыяла яшчэ большаму разгортваньню энтузіязму працоўных мас для барацьбы за выкананьне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для пасьпяховага сканчэньня задач трэцяга рэчаіснага году пяцігодкі, для разгортваньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы на гэтай базе.

Асаблівую зацікаўленасьць праяўлялі выбаршчыкі да пытаньня міжнароднага становішча Савецкага Саюзу, да пытаньня аб школьніцтве і аб барацьбе партыі супроць беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў. У выніку падрабязнага абгаварэньня ўсіх гэтых пытаньняў адзначаецца яшчэ большая гатоўнасьць працоўных мас Беларусі да рашучага адпору ўсялякім імперыялістычным намерам з боку капіталістычных інтэрвэнтаў, рашучае патрабаваньне да ўраду аб самым суровым пакараньні ўсіх шкоднікаў як з «прампартыі», так і да групы беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія зьяўляюцца агентамі польскага фашызму.

Пасьпяховае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі выразна гаварыла аб тым, што шматмільённыя масы сельскіх пралетараў, батрацтва, калгаснікаў, беднаты і серадняцтва галасуюць за генэральную лінію партыі і яшчэ больш аб'яднаюцца навакол камуністычнай партыі для пасьпяховага выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва на падставе генэральнай лініі партыі.

Контр-рэвалюцыйныя вылазкі клясава-варожых элемэнтаў і іх агентуры — апартуністаў розных колераў, нацыянал-дэмакратаў, нацыянал-апартуністаў сустрэлі самы рашучы адпор з боку ўсіх працоўных. Выбаршчыкі ў часе галасаваньня кандыдатур у саветы паказалі, што яны падтрымліваць толькі тых кандыдатуры, якія забясьпечваюць выкананьне генэральнай лініі партыі, і галасуюць супроць тых кандыдатур, што ня могуць забясьпечыць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Такім чынам, у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі адбывалася чыстка саветаў ад правых і «левых» апартуністаў, нацыянал-апартуністаў, і тым самым стваралася гарантыя, што саветы будуць сапраўднымі органамі дыктатуры пралетарыяту, якія, перабудаваўшы сваю работу, на справе будуць забясьпечваць своячасовае і поўнае выкананьне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, трэба ўяўляць сабе, што справаздачна-перавыбарчая кампанія — гэта ёсьць толькі першая частка па перабудове работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду. Гэта першая частка работы патрабуе далейшага свайго замацаваньня ў часе практычнай работы новых саветаў, патрабуе з боку партыі і рабочай клясы, усіх пралетарскіх арганізацый пастаяннай увагі да работы саветаў.

Асаблівае важнае значэньне мае гэта ў адносінах да сельсаветаў. Сельсаветы таксама, як і раённыя выканаўчыя камітэты, маюць непасрэднае дачыненьне да шырокіх мас сялянства, да вёскі, да калгаснікаў. Праз сельсаветы пралетарыят ажыцьцяўляе свае ўплывы на вёску, праз сельсаветы рабочая кляса праводзіць у жыцьцё ўсе мерапрыемствы ў барацьбе за сацыялізм. Гэта вымагае таго, каб усе пралетарскія арганізацыі гораду і вёскі дапамагалі саветам у іх штодзённай рабоце, дапамагалі савецкім арганізацыям замацаваць той палітычны і вытворчы энтузіязм, ва ўмовах якога адбывалася справаздачна-перавыбарчая кампанія. Пралетарскі ўплыў і кіраўніцтва ў сельсаветах павінны быць яшчэ больш узмоцнены.

Сьнежаньскі пленум ЦК У

Барацьба за фінплян—барацьба за пяцігодку за чатыры гады

Ліквідаваць студзеньскі прарыў, поунасьцю выканаць лютаўскі плян

МАБІЛІЗАЦЫЮ СРОДКАЎ— НА РЭЙКІ САЦСПАБОРНІЦТВА І УДАРНІЦТВА

Прэзыдыум цэнтральнага праўленьня саюзу сувязі канстатаваў, што РАБОТА РАБАЧКОМАЎ СУВЯЗІ Ў ГАЛІНЕ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ насельніцтва ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЯ. Асаблівая ярэнна праводзілася ўцягненьне членаў саюзу сувязі ўкладчыкамі ашчадкас.

Прэзыдыум прапанаваў усім райрабачкомам і упаўнаваженым саюзу сувязі прыняць усе меры да забесьпячэньня выкананьня дырэктыў партыі аб мабілізацыі сродкаў. У кожным рабочкоме павінны быць арганізаваны брыгады з лепшых ударнікаў па праверцы ахопу работнікаў сувязі пазыкай «Пяцігодка — за чатыры гады». Трэба разгарнуць масавую работу на прадпрыемствах і ва установах па вярбоўцы ўклад чыкаў у ашчадкасы, паслаць лепшых актывістаў у подшэфныя сельсаветы ў дапамогу мясцовым арганізацыям.

Уся работа па мабілізацыі сродкаў насельніцтва павінна быць пераведзена на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

ЗАСТАЛОСЯ 11 ДЗЁН

На працягу лютага павінна паступіць аднаразовага збору ад вёскі звыш 7 млн. руб., у тым ліку ад кулакоў—звыш 1.300.000 руб. Невялікі тэрмін да канца кампаніі абавязвае ўсе арганізацыі і ў першую чаргу фінансавы апарат і сельскія саветы разгарнуць сапраўды балевыя тэмпы работы, мабілізаваць грамадзянскасць і актыў вёскі на забесьпячэньне своячасовага выкананьня заданьняў.

Аднак, весткі, атрыманыя з месц, сьведчаць, што большасьць раёнаў недаацэнила важнасьці гэтай кампаніі, ня здолела арганізаваць, як належыць, работу. На 10 лютага спагнана ўсяго 20 проц. збору, у тым ліку з кулакоў толькі 7,6 проц. Між тым, трэба было з кулакоў спагнаць усе 100 проц. напічэньняў яшчэ да 1 лютага, а да 10 лютага павінна было паступіць 70 проц. усяго збору. Рад раёнаў спагнаў усяго па 2-5 проц. збору. Сьпіс гэтых раёнаў быў зьмешчан гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе» на чорнай дошцы. Пакуль што яшчэ няма вестак, якія-б паказвалі пералом у ходзе кампаніі.

Некаторыя раёны (ЧАВУСКІ, ЧАЧЭРСКІ і інш.), ня гледзячы на неаднаразовыя напамінаньні Наркамфіну БССР, упарта маўчаць, ня лічачы патрэбным нават паведаміць, ці перададены позвы ўсім платнікам.

Прарыў павінен быць ліквідаваны. Да сканчэньня тэрміну паступленьня ўсяго збору засталося 11 дзён. Гэты час павінен быць поўнасьцю скарыстаны.

Р.

Напярэдадні 13 гадавіны РСЧА

Прафсаюз МЭТАЛІСТАЎ праводзіць рад вечароў рабочых мэталяпрадпрыемстваў разам з падшэфнымі часьцямі Чырвонай арміі, прысьвечаных 13-й гадавіне РСЧА. На прадпрыемствах арганізуюцца вайсковыя гурткі, разгортваецца вярбоўка новых членаў Асавіяхіму, каладжваецца стралковыя спаборніцтвы паміж рабочымі пасасобных цэхаў, а таксама паміж рабочымі і чырвонаармейцамі.

***

Па ўсіх калектывах РАБОЧЫХ ТРАНСПАРТНІКАЎ у часе абедзеных перапынкаў праводзяцца гутаркі аб 13-й гадавіне РСЧА. 22-га лютага адбудзецца ўрачысты вечар транспартнікаў разам з падшэфнымі вайсковымі часьцямі. На вечары будуць прэміяваны лепшыя чырвонаармейцы-ўдарнікі базавой падрыхтоўкі. 23-га лютага таварыскі абед у падшэфнай вайсковай часьці.

ТАМ, ДЗЕ КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ... БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ

На апошнім пасяджэньні Менскай гарадзкой камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе былі заслуханы даклады з месц аб ходзе мабілізацыі сродкаў.

З дакладу прадстаўніка, **Калодзішчанскага сельсавету** выявілася, што апошні сельсавет мала робіць для забесьпячэньня выкананьня плянаў. Фактычна ў сельсавеце камісіі садзейнасьці няма. Працуе толькі адзін чалавек, дый той несыстэматычна—ад часу да часу. Няма камісій садзейнасьці і ў калгасах. Сельсавет не пакланяецца аб арганізацыі такіх камісій, ня гледзячы на выразныя дырэктывы з боку вышэйшых фінорганаў.

На сельсавеце рэалізавана пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» на 6.800 рублёў, але ўнесена на сёнешні дзень грошай толькі 2.133 руб. Такім чынам, **выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі толькі фармальнае.**

У ашчадкасу ўцягнута ўкладаў толькі на 430 рублёў замест 2.000 рублёў, вызначаных плянам. Ашчадкаса працуе зусім дрэнна і ня цікавіцца ўцягненьнем новых укладчыкаў.

Сельсавет не вядзе барацьбы з кулакамі, якія злосна ня хочуць уносіць напежачыя з іх плацежы. З 12 кулацкіх гаспадарак толькі супроць дзьвюх прыняты рэпрэсіўныя меры да неўнясеньня плацяжоў. Рэшта-ж кулакоў застаецца непакаранай. Гэтым самым сельсавет фактычна патурае кулацкому саботажу.

Гарадзкая камісія садзейнасьці прапанавала Калодзішчанскаму сельсавету ў пяцідзённы тэрмін арганізаваць камісію садзейнасьці ў сельсавеце і ў дэкадны тэрмін стварыць такія камісіі ва ўсіх калгасах. Прыняць меры да спагнаньня ўсёй запазычанасьці з кулакоў. Тых кулакоў, якія злосна ня выконваць сваіх абавязацельстваў, прыцягнуць да судовай адказнасьці. Камісія дала яшчэ цэлы рад указаньняў сельсавету па ўзмацненьні мабілізацыі сродкаў.

Недапушчальнае становішча з мабілізацыяй сродкаў у друкарні імя Сталіна. **Даволі сказаць, што ў такім буйным калектыве да гэтага часу ня было нават камісіі садзейнасьці.** Новая камісія яшчэ не прыступіла да работы. У выніку **каля 100 рабочых друкарні зусім не ахоплены пазыкай.** Рэшта-ж рабочых **падпісалася менш, чым на 50 проц. разьмеру пэнсіі.** Некаторыя рабочыя і служачыя канторы падпісаліся на зусім нязначныя сумы. Так, работнік канторы **Соснін**, які мае пэнсіі 260 руб. у месяц, падпісаўся ўсяго на 40 рублёў, работнік канторы **Сандлер**—на 20 рублёў (пэнсія —260 рублёў), наборачык **Рапапорт** падпісаўся на 25 рублёў (пэнсія 240 р.). Рабочыя **Тваровускі і Рэгіс** зусім не падпісаліся на пазыку (першы атрымлівае 200 руб. у месяц, другі—160 руб.).

Гарадзкая камісія садзейнасьці прызнала работу камісіі садзейнасьці друкарні імя Сталіна **незадавальняючай** і прапанавала ў дэкадны тэрмін поўнасьцю ахапіць падпіскай усіх рабочых і дадаткова правесьці яе сярод тых рабочых і служачых, якія падпісаліся менш, чым на 50 проц. (а такіх—пераважная большасьць).

Незадавальняючай прызнана таксама і **работа камісіі садзейнасьці заводу «Дрэваапрацоўшчык»**, дзе таксама пазыкай не ахоплена яшчэ каля 100 рабочых.

Камісія садзейнасьці **групкому № 6 саюзу будаўнікоў** прышла зусім непадрыхтаванай. Старшыня камісіі т. **Фурман** нават не пакланяецца аб падачы дакладных вестак па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых.

Гарадзкая камісія **абвясьціла вымову** тав. **Фурману** і прапанавала яму да будучага пасяджэньня камісіі падрыхтаваць падрабязныя і дакладныя весткі аб ходзе рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і аб рабоце камісіі садзейнасьці.

У Белкаапсаюзе пішуць...

а прыгарадныя гаспадаркі без кіраўніцтва і дапамогі

Пасеяць усе 600 гэкт.

У асіповіцкім нардоме поўна народу. Прышлі станцыйныя рабочыя, калгасьнікі, местачковая беднота і сялянне-беднякі бліжэйшых вёсак і хутароў. Так многа народу і так многа пакурылі, што ад тытунёвага дыму на адлегласьці 3-х крокаў нельга пазнаць добра знаёмага чалавека.

Старшыня РВК, адкрыўшы сход, заклікаў усіх да парадку. У парадку дня — важнае пытаньне аб разьвіцьці прыгараднай гаспадаркі ў Асіповічах. Даклядвае старшыня РВК. Яго прамова зводзілася да таго, каб стварыць у Асіповічах такую гаспадарку, якая-б дапаматла забясьпечыць рабочых ня толькі мясцовых, але каб даць гародніну і цэнтральным прамысловым гарадом.

— Мы атрымалі каля 600 гэктараў былых кулацкіх зямель, — гаварыў старшыня РВК. — Выдаткавалі ўжо 25 тыс. руб. на набудовы, на набыцьцё жывёлы і г. д. Мы павінны над гародніяй культуры засеяць ня менш 200 гэктараў.

У спрэчках даказвалі, што трэба купіць коняй, што трэба пачаць рамонт старога інвэнтару і падумаць аб набыцьці новага. Прычым многія беднякі тутжа на сходзе заявілі аб сваім жаданьні працаваць на палянцэньне рабочага забесьпячэньня.

— Работу пачаць заўтра-ж. — заяўлялі выступаўшыя.

У моры паперак

... Зусім іншыя тэмпы падрыхтоўкі да весняной гародняй кампаніі існуюць у апараце Белкаапсаюзу. Кожны з 300 супрацоўнікаў на працягу дня выдумляе і піша цыркуляры, формы і г. д. Вялізарны апарат Белкаапсаюзу плавае ў моры паперак, прычым паперкі ня звычайныя, а ўсё такія, што даюць матэрыяльць самастрахавацца.

— Вось вам копія дырэктывы, якую мы паслалі мясцом. Яна напісана на падставе пастановы пленуму ЦК КП(б)Б.

— Вось указаньне мясцом аб загатоўцы насеньня — пісалі на падставе пастановы СНК...

Гэта, галоўным чынам, і робіць апарат Белкаапсаюзу. Піша дырэктывы ці «на падставе», ні бяз усякіх падстаў. Формы справаздач заказваюцца цэлымі вагонамі для таго, каб потым іх скасоўваць. Фактаў бюракратызму і цяганіны ў Белкаапсаюзе шмат. Чаго варты такі факт: разнарадку на 600 пар галёш замест станцыі Вятнае, Чарэйскага раёну, адправілі на станцыю Вятка, і галёшы, здаецца, яшчэ зараз нелка вандруюць. З тэтым злом ніхто не вядзе барацьбы. У апараце — 30 рабочых вылучэнцаў, якіх скарыстоўваюць на ін структарскай рабоце, а ў самім апараце няма ні аднаго.

Правая рука ня ведае пра левую

Якую дапамогу атрымалі асіповіцкія рабочыя і арганізацыі ў справе падрыхтоўкі да весняной гародняй кампаніі? На асноўным пытаньні — падрыхтоўцы цягавай сілы — асіповіцкія арганізацыі атрымалі ў адзін дзень 2 розныя дырэктывы. Вось першая з іх:

«Усім ЦРК і раённым спажывецкім т-вам. Улічваючы зусім абмежаваную колькасьць трактароў да весняной пасеўнай кампаніі, Белкаапсаюз прапануе неадкладна прыкупіць патрэбную колькасьць коняй з такім разьлікам, каб ваша гаспадарка была ўкамплектавана цягавай сілай да 15-20 лютага, выходзячы з вашай пасеўнай плошчы. Аб ходзе куплі коняй інфармуйце нас. Інструктар забесьпячэньня ПАЛОНСКІ».

Гэта паперка была ад 11 студзеня за № 31. І ў той-жа дзень была атрымана другая паперка, датаваная тымжа 11 студзеня ўжо за № 32 і ва подпісам вышэйшага начальніка — нам. старшыні праўленьня **Кандраля** і заг. плянавым аддзелам **Бялугі.**

«Да асобага распараджэньня спыніць будаўніцтва і куплю коняй, пакуль мы вас не паведамім».

Работнікі раёну ня ведалі, якую-ж дырэктыву выконваць. Пасхалі ў Менск даведацца, што рабіць.

— **Можаце купленую жывёлу прадаць,** — аўтарытэтна заявіў **Бялуга**, растлумачыўшы, што Цэнтрасаюз не дае столькі сродкаў, колькі патрэбна.

— Што-ж, выходзіць забраную зямлю ў кулакоў вярнуць назад? — запытаўся з абурэньнем прадстаўнік раёну.

— Можаце аддаць каму хочаце, — адказаў Бялуга.

Вось якую «дапамогу» атрымалі асіповіцкія арганізацыі ад Белкаапсаюзу.

З 29—15 бяспрытульных

Усяго прыгарадных гаспадарак налічваецца 29 на плошчы ў 1.600 гэктараў. З іх 14 гаспадарак на плошчы 990 гэкт. фінансуюцца Белкаапсаюзам. За апошнія 14 гаспадарак раённыя спажывецкія т-вы адказваюць, а за іншыя 610 гэктараў ніхто не адказвае. Чаму-ж Белкаапсаюз скараціў пасеўную плошчу, якая знаходзілася ў веданьні раённых спажывецкіх т-ваў? Мала сродкаў. А каб знайсьці сродкі, зьвярнуцца за дапамогай да пралетарскай грамадзкасьці — аб гэтым іраўніі Белкаапсаюзу не падумалі. Такім чынам, значная частка гаспадарак пастаўлена пад пагрозу зрыву плянаў весняной кампаніі.

Кансультант сельска-гаспадарчага сэктару Белкаапсаюзу **Палонскі** проста заявіў:

— Мы ніякай увагі раённым прыгарадным гаспадаркам не аддавалі. Больш думаем аб ЦРК. — пацьвердзіла і загадчык сэктару тав. **Сулькіна.**

«Дырэктывы паслалі своячасова»

На ЦРК становішча з падрыхтоўкай да весняной кампаніі таксама катастрафічнае. Прыгарадныя гаспадаркі насенньнем амаль не забясьпечаны. Напрыклад, насеньня турэку загатоўлена ўсяго 2,1 проц., капусты — 15 проц., моркві — 5,6 проц. і нават насеньня цыбулі, якога ў Беларусі вельмі шмат, загатоўлена толькі 2,8 проц.

На пытаньне, што зробілі Белкаапсаюзам для фарсаваньня загатоўкі насеньня, тав. Сулькіна адказала:

— Мы своячасова паслалі дырэктывы.

Але апарат дырэктыў, якія Белкаапсаюзаўскія работнікі ўмела высылаюць, ніякіх канкрэтных мер ня было ўжыта.

Прафсаюзныя арганізацыі таксама мала ўвагі аддаюць мабілізацыі мас для дапамогі прыгарадным гаспадаркам. ЦСНСБ паслаў некалькі брыгад для загатоўкі насеньня, але сувязь з брыгадзірамі не наладзіў.

У 1931 г. у прыгарадных гаспадарках ЦРК павінна быць закладзена 50 тыс. парнікоў. Між тым, закладзена ўсяго 28 тыс., у той час, як работа гэта павінна быць ужо скончана. Горш як усюды ў Менскім ЦРК, які замест 10 тыс. рам залажыў толькі 2 тыс. Выраб парніковых рам скончаны, але работнікі ЦРК не падрыхтавалі патрэбнай колькасьці катлаванаў. Зараз работнікі ЦРК думаюць паставіць парнікі пафранцуску, г. зн. наверсе, між тым, паводле цьверджаньняў навуковых работнікаў, французкая форма ўстаноўкі парнікоў карысьці не дае. Але работнікам ЦРК, як відаць, важна толькі **фармальна выканаць заданьне**

Курс на самацёк

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б даў установу асвоіць прыгарадныя гаспадаркі на плошчы ў 25 тыс. гэкт. Але для выкананьня гэтай дырэктывы робіць ня вельмі мала. ЦРК патрэбна 4.000 рабочых, а жыць гэтым рабочым няма дзе. Будаўніцтва разгортваецца вэсьма слаба. Няма лесаматар'ялаў, цьвікоў, і ўсе спадзяюцца на самацёк.

Кепска з забесьпячэньнем цягавай сілай. Дырэктыва Бялугі і Кандраля аб тым, каб спыніць куплю коняй, пайшла па ўсіх прыгарадных гаспадарках. Адным толькі ЦРК зараз не хапае 1.220 коняй. З 11-ці трактараў 4 патрабуюць рамонту.

Наогул з рамонтам с.-г. інвэнтару справа кепская. Атраном Белкаапсаюзу **Зімпер** ня ведае, дзе і што трэба рамантаваць. Яна ніяк на можа сабрацца скласьці плян рамонту інвэнтару, матывуючы тым, што ня хоча загружаць апарат Белкаапсаюзу, авышнормава.

Пагражаючае становішча з вывазкай угнаеньня. Горш з гэтай справай у наступных ЦРК: Менскім, які вывез толькі каля 20 проц. угнаеньняў, у Віцебскім ЦРК — 15 проц. і Гомельскім — усяго 10 проц.

Прыгарадным гаспадаркам БССР запараджана 355 вагонаў штучнага угнаеньня, але для расьсеваньня яго няма ні адзіна «тукавай» сявалкі.

Вось становішча, якое ставіць пад пагрозу невыкананьне плянаў засеву гародаў.

Выкрыць да канца апартуністаў і бюракратаў

Апарат Белкаапсаюзу не перабудаваў сваёй работы і ня кіруе каапэрацыйнай сеткай так, як гэтага патрабаваў пленум ЦК КП(б)Б.

Апартуністычныя элементы, бюракраты моцна яшчэ сядзяць на сваіх месцах.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі Белкаапсаюзу яшчэ не перабудавалі сваёй работы і ня сталі на шлях рашучай барацьбы са скажэньнямі генэральнай лініі партыі. Такое становішча і прыяло да таго, што левая рука апарату ня ведае, што робіць правая. Недарма атраном МЦРК тав. **Біліч** абураўся тым, што да весняной пасеўнай кампаніі выпушчана Белкаапсаюзам каля **20 розных форм справаздач.**

Крытыка недахопаў у работе апарату Белкаапсаюзу разгорнута далёка невыстарчальна. Рабочы кантроль над працай апарату вельмі слабы.

Трэба партыйным і прафсаюзным арганізацыям як належыць праверыць работу апарату Белкаапсаюзу. Трэба пры дапамозе рашучай бальшавіцкай самакрытыкі выкрыць да канца апартуністаў, бюракратаў і тамаўзнаўцаў.

А. Маньковуў.

Апэрацыйная зводка

аб ходзе рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка»

На 10 лютага па БССР рэалізавана пазыкі на 17.676 тыс. руб., што складае 83,4 проц. пляну. Сярод рабочых і служачых рэалізавана па 13.876 тыс. руб. (101. проц.), сярод сялян—на 2.633 руб. (43,9 проц.) і сярод іншых—на 1.167 тыс. руб. (77,8 проц.).

Апошняя дэкада не дала амаль ніякага зруху ў рэалізацыі пазыкі сярод сялян; за час з 1 па 10 лютага рэалізавана ўсяго на 90 тыс. руб., або... 1,5 проц. кантрольнай лічбы.

Адстаючыя раёны пічога не зрабілі для пералому ў прасоўваньні пазыкі. **Гарадоцкі** раён даў прырост за 10 дзён па 200 руб., **Журавіцкі**—на 300 руб., **Чырвонапольскі**—на 500 руб., **Крычаўскі**—на 400 руб., **Кохановускі**—на 200 руб., **Дубровенскі ня даў зусім ніякага прыросту.**

Гэтыя «прыросты» зусім не павялічылі процанту выкананьня заданьняў па пералому ў раёнах супроць становішча на 1 лютага.

Трэба адзначыць, што ёсьць раёны, якія дагэтуль ішлі папярадзе па рэалізацыі пазыкі, але зараз супакоіліся на дасягнутых выніках і пачалі адставаць. Напрыклад, **Любаньскі, Лагойскі і Расьнянскі** раёны розам рэалізавалі пазыкі за дэкаду ўсяго на... 500 рублёў.

Гэтай агіднай пядбайнасьці ў рэалізацыі пазыкі трэба палажыць канец.

Ш.

Фініш усебеларускай лыжнай эстафэты

24-га лютага, у 4 гадз. дня, на Пляцы Волі адбудзецца фініш усебеларускай лыжнай эстафэты, **прысьвечанай 10-му ўсебеларускаму зьезду саветаў.**

Да фініш прыбудуць 100 лыжнікаў з розных раёнаў БССР.

У гарадзкім тэатры адбудзецца вечар спатканьня ўдзельнікаў усебеларускай лыжнай эстафэты і провадаў удзельнікаў усесаюзнай лыжнай эстафэты «Прапа і абарона СССР».

Спыніць цкаваньне тав. Гарашчыні

Начальнік станцыі Буда-Кашалеўская, член партыі т. **Гарашчыня** прапрацаваў на чыгунцы 32 гады. За гэты час тав. Гарашчыня быў на розных пасадах, а з 1927 году працуе начальнікам станцыі. Работа станцыі пад яго кіраўніцтвам была пастаўлена на належную вышыню.

Парткіраўніцтва, здавалася-б, павінна было дапамагаць т. Гарашчыні ў яго рабоце, між тым, сакратар парт'ячэйкі **Іваноў** недапушчальна цкуе тав. Гарашчыню.

Іваноў ня ўзьлюбіў Гарашчыню за тое, што апошні звольніў тэлеграфістку — жонку яго прыяцеля, як неадпаведную свайму прызначэньню.

Для Іванова ўсё ні па чым — ні транспінпляну, ні дырэктыва РК КП(б)Б. Ня гледзячы на тое, што ён быў выпат з пасады сакратара ячэйкі і атрымаў на від за цкаваньне т. Гарашчыні, Іваноў ня спыняе гэтай сваёй агіднай «дзейнасьці».

Адночы Гарашчыня на некалькі хвілін спазьніўся на пажарную трывогу. Ня гледзячы на тое, што ў акце аб правядзеньні трывогі запісана, што апошняя працягвалася ўсяго 5 хвілін і прайшла адзавальняюча, Гарашчыня, па распараджэньні начальніка 6-га эксплёатацыйнага раёну Заходняй чыгункі тав. **Міхайлава**, пераводзіцца на ніжэйшую пасаду памочнікам начальніка станцыі Уза.

Тав. Міхайлаў паддаўся ўплыву Іванова і на скаргу тав. Гарашчыні адказаў, што пастанова бюро РК КП(б)Б, у якой гаворыцца, што Гарашчыня на пасадзе начальніка станцыі сабе апраўдаў і пераведзен цілкам правільна, вынесена... у сямейным парадку.

Ні тав. Міхайлаў, ні тав. Іваноў нават не пакланяліся аб перадачы станцыі ў рукі добрага кіраўніка. Кіраўніцтва станцыяй перадаецца быц. памочніку нач. станцыі, які даўно апошнюю да заняпаду.

Належным органам трэба ўмяшацца ў гэту справу. Мэтад адзінаначальніцтва пастаўць на належную вышыню. Вінаватыя ў цкаваньні тав. Гарашчыні павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

ВЫМОВЫ КІРАЎНІКОМ ФАБРЫКІ „ДЗЬВІНА" ГУТЫ „ПРАЦА" І ГОМСЕЛЬМАШУ

за спазьненьне ў складаньні справаздач

У сучасны момант, калі пастаянны нагляд за выкананьнем прамфінпляну набывае асабліва важнае значэньне, рад прадпрыемстваў сыстэматычна зрываюць работу ВСНГ па складаньні вынікаў асноўных паказальнікаў работы прамысловасьці.

Да гэтага часу яшчэ няма матар'ялаў аб зьмяненьні сабекошту за асобны квартал па Маталяраб'яднаньні — ад 8 прадпрыемстваў, Хэмаб'яднаньні — ад 4, Шкляаб'яднаньні — ад 3, Тэкстыльаб'яднаньні — ад 2, Будаб'яднаньні — ад усіх заводаў, а аб руху зарплаты —па Скураб'яднаньні і па Тэкстыльаб'яднаньні. Па іншых формах справаздачнасьці таксама ёсьць значная запазычанасьць. Загад ВСНГ БССР аб падачы тэлеграфных данясеньняў ня выконваецца. Шэйаб'яднаньне і Паліграфаб'яднаньне 15 лютага яшчэ ня ведалі аб выкананьні прамфінпляну ў цэннасным выяўленьні.

Становішча з ухілам выкананьня асноўных паказальнікаў прамфінпляну зьяўляецца агідным фактам, які характарызуе недапушчальныя адносіны з боку кіраўнікоў аб'яднаньняў і прадпрыемстваў.

У загадзе ВСНГ за подпісам тав. СТРАКОЎСКАГА прапануецца ўсім кіраўнікам аб'яднаньняў і прадпрыемстваў забясьпечыць тэрміновую ліквідацыю запазычанасьці па статыстычнай справаздачы. За сыстэматычную непадачу асноўных форм справаздачнасьці абвешчана СУРОВАЯ ВЫМОВА з апублікаваньнем у друку КІРАЎНІКОМ ІЛЬНАПРАДЗІЛЬНАЙ Ф-КІ «ДЗЬВІНА», ГУТЫ «ПРАЦА» І ГОМСЕЛЬМАШУ.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— **Культпроп ЦК КП(б)Б** прапануе абавязкова зьявіцца 13 гадз., у пак. 14, наступным т.т.: Лур'е (Кампуз), Югаву (у-т гісторыі), Суворану (БДУ), Аксэльроду (Дзяржплян) і Валабрыскаму (БАН).

У 14 гадз. у Культпроце адбудзецца пасяджэньне сэкцыі партасьветы мэтадбюро ЦК КП(б)Б. Павінны зьявіцца т. т. Модель, Улазаў, Каган, Гурвіч, Макоўскі, Янкевіч, Гаеўскі, Гіланд, Орліс.

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз., пак. 19—груповая кансультацыя для завочнікаў Кампузу, СПШ і т. т., што займаюцца самаадукацыяй па беларускай мове і рэв. руху.

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** паведамляе слухачоў пачатковай гарпартшколы, што заняткі пазьменных груп адбудуцца 18 лютага з 10 гадз. раніцы ў наступных памяшканьнях: па вул. К. Маркса ў Доме Камасьветы займаюцца групы: а) першая пазьменная—у куцку «Паліткатаржаніц», б) другая пазьменная—у пакоі № 26, в) сёмая пазьменная яўрэйская група—у пакоі № 18, г) група Меншыню—у пакоі № 24, уваход у памяшканьне з вул. Энгельса. Трэцяя пазьменная група займаецца па Ленінскай вул. д. № 2, у пам. ленкутка Ментрыкатажу. Усім слухачом і прапагандыстам, якія працуюць у пазьменных групах, патрэбна зьявіцца без спазьненьня на паказаным адрасе.

— **Культпроп гаркому** паведамляе, што чарговыя заняткі вечэрніх курсаў гарпартактыву адбудуцца 18-II-31 г. у 19 гадз., у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б (3-ці паверх). Тэма заняткаў: лекцыя праф. Вальфсона «Матэрыялізм і ідэалізм і барацьба з рэлігіяй». Лука ўсіх т. т., што займаюцца на курсах абавязкова і без спазьненьня.

— **Мед. ін-т.** У 20 гадз. у анатамічным корпусе Мед. ін-ту (вялікая аудыторыя) адбудзецца агульны сход студэнтаў і навуковых працаўнікоў Мед. ін-ту. Парадак дня: 1. Праф. ВЫДРА аб становішчы БАН, 2. Аб давыбарах акадэмікаў.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 83.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	12-80	Начны рэдактар	5-12
Сакратар	10-71	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., і гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Контэнарытны рахунак выдавецтва № 52|90600 у Дзяржбанку.
Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 83, 2-гі паверх, тэл. 7-81.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на САКАВІК і далейшыя м-цы 1931 г. на газ. „ЗЬВЯЗДА"

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА на 1 месяц—1 руб.

З 1-І—31 г. газэта ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫННА

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Сёньня, 18 лютага. Паказ для саюзу спатканьдзельчыкаў. Пач. а 8 гадз.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
З прычыны выключнага посьпеху ашчэ тры дні Гукавы фільм справа 13 дзён «ПРАМПАРТЫІ»
ХРОНІКА САЮЗКІНО № 1 за 1931 г.
Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура"
Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно (Трастбелдзяржкіно)
Сапраўднае жыцьцё
Пач. сэансаў: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса з—5 гадзін

КІНО „Інтэрнацыянал"
Новы савецкі фільм вытв. „Працкіно"
ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ
Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г.30 м.

КІНО „Пралетары"
Апошнія 3 дні 16, 17 і 18 лютага мастацкі фільм паводле раману ШОЛОМ-АЛЕЙХЭМА
МАБУЛ (Крывавы патэк)
драма ў 9 частках.
Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр"
Дзьве фільмы у 1 сэанс
1) ПРЫГОДЫ АРЫШКІ ў 5 части.
2) Сенька Афрыканец ў 2 части.
Пач. сэансу з 1 г. д. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА
нямецкі ў 6 частках.
Пач. 7 г., 8 г., 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 г.

БАН
20 лютага ў 12 гадз. дня ў памяшканьні ІНСТЫТУТУ МОВАЗНАЎСТВА БАН
будзе прачытаны даклад на тэму:
„Аб узмацненьні інтэрнацыянальнага элемэнту мовы".
Запрашаюцца рабочыя, навуковыя працаўнікі і настаўніцтва.
Ін-т Мовазнаўства.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
сэктар кнігараспаўсюджаньня.
Да XIII-й гадавіны Чырвонай арміі
Самахвалаў.—13-я гадавіна Чырвонай арміі (друкуецца).
Бронін.—Лешн і Чырвоная армія 52 стар. Цана 10 кап.
Пуанкарэ пралье крыві (зборнік артыкулаў, друкуецца).
Пуанкарэ-вайна (зборнік артыкулаў, друкуецца).
Варашылаў.—Сталін і Чырвоная армія. стар. 44, цана 6 кап.
Рабінавіч.—XVI-ы зьезд УсеКП(б), абарона краіны і Чырвоная армія. стар. 68, цана 10 кап.
Пінежскі.—Чырвоная гвардыя, стар. 144, цана 40 кап.
Какорын.—Партыятыў і задачы абароны СССР, стар. 100, цана 45 кап.
„ Абарона СССР і пяцігодка. стар. 48, цана 15 кап.
Алтайскі.—Варашылаў (паэма), стар. 152, цана 1 р. 10 кап.
Гальскі.—36 дэкад у годзе (аб рабоце ячэйкі Асоавіяхіму ў калгасе), стар. 48, цана 10 кап.
Маскін.—Саветы ў барацьбе за мір. стар. 70, цана 15 кап.
Маліноўскі.—Жанчына і абарона. стар. 32, цана 5 кап.
Буйскі.—Чырвоная армія на ўнутраным фронце, стар. 80, цана 23 кап.
Леонцеў.—Стралковы гурток і як яго наладзіць. стар. 48, цана 10 кап.
Даёмін.—Наладжаньне піру для стралковага гурка, стар. 50, цана 15 кап.
Парасьнкін.—Памятныя дні, стар. 48, цана 12 кап.
Дзяменцеў.—На франтох, стар. 48, цана 15 кап.
Лясны.—Пра дні капулых, стар. 40, цана 9 кап.
Львоўскі.—Пад ботам легіёнаў, стар. 56, цана 10 кап.
Унукаў.—Ці страшыць нас вайсковая тэхніка, стар. 60, цана 12 кап.
Калтынін.—Барацьба за мір і Чырвоная армія, стар. 48, цана 10 кап.
Хведаровіч.—Баявыя песьні, стар. 48, цана 15 кап.
Весьнін.—У бойках за Кастрычнік, стар. 72, цана 16 кап.
Кпюеў.—Першая конная армія, стар. 68, цана 15 кап.
Карцаў.—Радавы Жасьлен, стар. 60, цана 10 кап.
Панч.—Блакітныя зьвалены, стар. 168, цана 40 кап.
Харытонаў.—Чырвоная армія—неч пралетарскай дыктатуры, стар. 68, цана 15 кап.
Костарэў.—Заяжная хрэпіна, стар. 95, цана 65 кап.
Яўціхіеў.—Танкі і барацьба з імі, стар. 64, цана 35 кап.
Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і спажыўнаапэрацыі.

Жансэктар агіт.-мас. аддзелу гарному КП(б)Б склікае
19 лютага, у 7 гадз. вер., у памяшк. Дому Камасьветы імя К. Маркса
ПЛЕНУМ УСІХ ДЭЛЕГАТАК г. Менску
з наступным парадкам дня:
1) Вынікі студэнцкага пленуму ЦК КП(б)Б.
2) Прапа дэлегацкіх сходаў.
На пленум, апрача дэлегатак, запрашаюцца таксама жансэктары, жаночы актыў і кіраўнікі дэлегацкіх сходаў.
Білеты на пленум сакратары ячэек павінны атрымаць у гаркоме, пачынаючы з 17-II—31 г. з 12 да 4 гадз. дня у пак. № 10.

ВЯЧЭРНІ КАМУНІСТЫЧНЫ УН-Т БЕЛАРУСІ
даводзіць да водама студэнтаў партыйнага і савецкага аддз. студэнцкага набору, што
ЗАНЯТКІ ПАЧЫНАЮЦЦА 10 ЛЮТАГА,
у 6 гадз. 30 м. веч.
Усе студэнты павінны зьявіцца на заняткі.
Вячэрні Камвуз.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

КАМІСІЯ ЦКК-НК РСІ прыступіла да праверкі і
ЧЫСТКІ апарату ЦК т-ва „Чырвонага Крыжу" БССР.
Просьба да ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і асоб, якія маюць той ці іншы кампрамэтуючы матар'ял на работнікаў апарату ЦК т-ва, а таксама матар'ял, які характарызуе недахопы ў рабоце апарату (выпадкі бюракратызму, цяганіны і г. д.), накіроўваць у ЦКК-НК РСІ (Савецкая, 55, пакой 10) Цэнтральнай камісіі па чыстцы.
Камісія па чыстцы.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫ